Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 35 (5409)
СЕРАДА
12
ЛЮТАГА
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ЛІТАРАТУРА СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ — З ДАКЛАДА СТАРШЫНІ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ ТАВ. **КЛІМКОВІЧА** НА III ПЛЕНУМЕ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ СССР 11 ЛЮТАГА 1936 Г.
ТЭЛЕГРАМЫ М. ГОРКАГА ТАВ. ЧАРВЯКОВУ І ПЛЕНУМУ ПРАЎЛЕННЯ ССП СССР.
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — НАСУСТРАЧ ГАДАВІНЕ СТАЛІНСКАГА СТАТУТА.
Ром. ЛЯПІЧ — ДРУЖБА НАРОДАЎ.
Ал. МІРОНАЎ — 2-я ГАДАВІНА ЧЭЛЮСКІНСКАЙ ЭПАПЕІ.
Д. МАЛЕВІЧ — МЕТАД ДАЯРКІ БАШКІРАВАЙ.
ЗА РУБЯЖОМ:
ВЫКРЫЦЦЕ ЯПОНСКАЙ ВЫДУМКІ.
ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ КАНФЛІКЦЕ НА ДАЛЕКІМ УСХОДЗЕ
ПРАБЫВАННЕ тав. ТУХАЧЭЎСКАГА Ў ПАРЫЖЫ.

Насустрач гадавіне сталінскага статута

17 лютага споўніцца год з дня зацвярджэння другім з'ездам калгаснікаў - ударнікаў сталінскага статута сельскагаспадарчай арцелі.

Кожны пункт прыкладнага статута прынят пад непасрэдным кіраўніцтвам вялікага правадыра народаў таварыша **Сталіна.**

Год работы па сталінскаму статуту — гэта год барацьбы за ўмацаванне калгаснага ладу, за заможнае і шчаслівае жыццё калгасных мас.

Выдатныя вытворчыя перамогі заваяваны ў мінулым годзе ў сельскай гаспадарцы. Старшыня калгаса «Чырвоны партызан» Менскага раёна ордэнаносец т. **Бейне Сяргей** на ўсебеларускай нарадзе перадавікоў ураджайнасці заявіў: «Сталінскі статут забяспечыў нам вялікі ўраджай, вясёлае і радаснае жыццё».

Так гаворыць не адзін толькі Бейне. З трыбуны ўсебеларускай нарады перадавікоў ураджайнасці лепшыя людзі калгаснай вёскі падкрэслілі вялікае значэнне статута ў справе правільнага наладжання калгаснага жыцця.

Небывалыя поспехі дасягнуты ў росце калгасных кадраў, узмацнення калгаснай дысцыпліны, разгортвання калгаснай дэмакратыі, у справе вылучэння здольных і вопытных жанчын на кіруючую работу.

Сталінскі статут калгаснага жыцця — гэта адзін з найярчэйшых палітычных дакументаў краіны сацыялізма. Прыкладны статут даў многамільённай калгаснай масе магутную зброю для далейшых перамог сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

«Калі вы жадаеце ўмацаваць арцель, — гаварыў таварыш **Сталін** на камісіі з'езда па выпрацоўцы статута, — калі вы жадаеце мець масавы калгасны рух, які павінен ахапіць мільёны дваароў, а не адзінкі і сотні, калі вы гэтага жадаеце дабіцца, — вы пры цяперашніх умовах павінны абавязкова ўлічыць апрача агульных інтарэсаў калгаснікаў, іх асабістыя інтарэсы».

Гэта мудрае сталінскае спалучэнне інтарэсаў грамадскай сацыялістычнай гаспадаркі з асабістымі інтарэсамі кожнага калгасніка зразумелі калгаснікі і калгасніцы і сустрэлі з велізарным энтузіязмам. Калгаснікі добра зразумелі, што статут сельскагаспадарчай арцелі накіраваны на яшчэ большае ўмацаванне калгаснага ладу.

Вось чаму такі дарагі і блізкі для кожнага калгасніка статут. Вось чаму калгаснікі зусім законна абрушваюцца на віноўніка малейшага скажэння сталінскага статута.

На вялікі жаль, у нас ёсць рад фактаў грубага парушэння статута сельскагаспадарчай арцелі. У калгасе «Серп і молат», Нікалаеўскага сельсавета, Віцебскага раёна, напрыклад, па настойванню старшыні калгаса выключан з калгаса член арцелі т. **Піскуноў** толькі за тое, што ён «крыху пашумеў на сходзе». Тав. Піскуноў, за пяць год прабывання ў калгасе не меў ні аднаго спагнання. У калгасе імя Гікало гэтага-ж раёна цяжарную калгасніцу **Буднякову** адпусцілі ў адпачынак толькі за два тыдні да родаў. Гэтыя факты не адзіныя.

Па статуту арцелі гаспадаром калгаса з'яўляецца агульны сход. З усёй сілай трэба падкрэсліць недапушчальнасць такіх фактаў, калі правы агульнага схода захоўваюцца толькі фармальна. Далёка не ўсюды агульны сход выкарыстоўваецца, як сапраўдны вагар узлыму грамадскай актыўнасці ўсёй масы калгаснікаў, як магутны сродак грамадскага кантролю.

Нямала фактаў грубага парушэння статута кіраўнікамі асобных калгасаў, МТС і раённых арганізацый. Аб гэтым нядаўна з усёй рэзкасцю было сказана ў пастанове ЦК ВКП(б) і СНК Саюза аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў нячорназёмнай паласы.

Праверка выканання сталінскага статута — вось чым прапануюць адзначыць гадавіну прыняцця статута лепшыя майстры высокіх ураджаяў БССР.

У сваім звароце да ўсіх калгаснікаў і калгасніц БССР удзельнікі ўсебеларускай нарады па ўраджайнасці пісалі: «Мы прапануем адзначыць надыходзячую гадавіну прыняцця статута праверкай выканання яго ва ўсіх калгасах БССР. Абавязваемся самі і заклікаем усіх калгаснікаў правесці гэту праверку пад сцягам барацьбы за выдатную сяўбу, за вышэйшы ўраджай».

Няма ніякага сумнення ў тым, што заклік лепшых людзей калгаснай вёскі будзе падхоплены ўсімі калгаснікамі і калгасніцамі Савецкай Беларусі.

Але праверку трэба арганізаваць. Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, зямельныя органы павінны зараз-жа разгарнуць вялікую палітычна-масавую работу ў калгасах, брыгадах і ўцягнуць усіх калгаснікаў у праверку рэалізацыі статута.

Праверка рэалізацыі статута сельскагаспадарчай арцелі перш за ўсё павінна быць цесна звязана з абгаварэннем бягучых задач калгасаў. Кожны дзень набліжае нас да веснавой сяўбы. Ужо зараз у кожным калгасе пытанне аб гатоўнасці да сяўбы павінна быць у цэнтры ўвагі. Праверка, як у калгасах ажыццяўляецца статут, павінна дапамагчы кожнаму калгасу лепш падрыхтавацца да веснавой сяўбы.

Справаздачы старшынь калгасаў на агульных сходах, праверка работ дзіцячых садоў, яслей, хатлабараторый адыграюць вялікую ролю ў справе паляпшэння ўсіх відаў работ у калгасе, далейшага разгортвання калгаснай дэмакратыі, яшчэ большага ўмацавання калгаснага ладу.

Праверка рэалізацыі сталінскага статута адыграе бясспрэчна велізарнейшую ролю ў справе вывучэння людзей, вылучэння лепшых энтузіястаў барацьбы за ўраджай, у асаблівасці жанчын, на кіруючую работу.

Лепшая адзнака гадавіны сталінскага статута — гэта праверка яго выканання. Гэту праверку трэба правесці пад сцягам барацьбы за выдатную сяўбу, за стаханаўскі ўраджай, за папаўненне вялікай арміі стаханаўцаў сельскай гаспадаркі.

Справа гонару ўсіх раённых партыйных і совецкіх арганізацый, усіх добрасумленных калгаснікаў і калгасніц прыняць актыўны ўдзел у гэтай пачэснай, вялікай і адказнай справе.

СТАРШЫНІ ЦВК БССР — Т. ЧАРВЯКОВУ

НА ЖАЛЬ, ПРЫЕХАЦЬ НЕ МАГУ. ПРАШУ ПЕРАДАЦЬ ТАВАРЫШАМ ЛІТАРАТАРАМ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ МАЁ ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ. ЦІСНУ РУКУ.

М. ГОРКІ.

ПРЫВІТАННЕ МАКСІМА ГОРКАГА ПЛЕНУМУ

ГОРАЧА ВІТАЮ ТАВАРЫШОЎ. ЖАДАЮ ПОСПЕХУ Ў РАБОЦЕ ПЛЕНУМА. ШКАДУЮ, ШТО НЕ МАГУ БЫЦЬ РАЗАМ З ВАМІ.

М. ГОРКІ.

Форос. 9 лютага.

ПЕРАД СКЛІКАННЕМ СЕСІІ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

У сувязі з скліканнем чарговай сесіі Беларускай акадэміі навук 15 лютага 1936 года рад вучоных і навукова-даследчых устаноў БССР на сваіх пасяджэннях высунулі кандыдатуру тав. **Сурты Івана Захаравіча** ў сапраўдныя члены Акадэміі.

Тав. Сурта шырока вядомы навуковай грамадскасці сваімі навуковымі работамі ў галіне метадалогіі і гісторыі прыродазнаўства.

Тав. Сурта мае вялікія заслугі на фронце барацьбы супроць механіцызма і меншавіцтвуючага ідэалізма, за чыстату марксісцка-ленінскай метадалогіі ў прыродазнаўстве. Яго кандыдатуру высунула група вучоных Беларускага дзяржаўнага універсітэта, навуковы совет медінстытута, акадэмікі і навуковыя работнікі інстытутаў біялогіі, хіміі, фізіка-матэматычнага інстытута Беларускай акадэміі навук.

ШЧАРБАКОЎ, БУРСТЫН, ШПЕНЦЭР.

НА ПЛЕНУМЕ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ СССР

ЛІТАРАТУРА СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

З даклада старшыні праўлення ССП Беларусі т. КЛІМКОВІЧА на III пленуме саюза пісьменнікаў 11 лютага 1936 года

Таварышы! Наш пленум ёсць пленум дружбы народаў.

«А дружба паміж народамі СССР — вялікае і сур'ёзнае заваяванне. Бо пакуль дружба існуе, народы нашай краіны будуць свабодны і непераможны; ніхто не страшны нам, ні ўнутраныя, ні знешнія ворагі, пакуль гэта дружба жыве і здраўствуе». Так сказаў таварыш Сталін таджыкскім і туркменскім калгаснікам.

І тое, што мы сабраліся іменна тут, у Совецкай Беларусі, набывае асаблівае значэнне. Прадстаўнікі найвялікшай культуры, якую калі-небудзь стварала чалавецтва, прадстаўнікі новай сапраўды чалавечай культуры працоўных усіх народаў, насяляючых неабдымны Совецкі Саюз, на чале з магутным рускім народам, сышліся каля граніцы, за якою цягнецца чорная ноч нацыянальнага гнёту, рабскага бяспраўя працоўных, жудаснага бескультур'я і фашысцкага мракабесся.

На фоне гэтай ночы — якім грандыёзным, беламрамарным помнікам нашай эпосе высіцца наша культура, адзная і шматмоўная культура перамогшага пролетарыята!

І першае, што хочацца сказаць, бачачы магутны калектыў пісьменнікаў усесаюзнай літаратуры, спаяны брацкай любоўю, баявым пролетарскім інтэрнацыяналізмам, узаемным падтрыманнем і дружбай: няма ў свеце сілы, якая магла-б перамагчы саюз вялікіх народаў.

Таварышы! Наш пленум і наша дружба і наш рост ёсць рэзультат велізарнай работы ВКП(б), ёсць рэзультат нястомных клопатаў і геніяльнага кіраўніцтва найвялікшага друга, правадыра і настаўніка ўсіх народаў — Іосіфа Вісарыёнавіча **Сталіна,** ёсць рэзультат брацкай дапамогі Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік усім раней адсталым народнасцям, цяпер брацкім совецкім рэспублікам.

Дакастрычніцкая Беларусь, прыдушаная падвойным гнётам, апаясанан «чартой аседласці», бязграматная і бескультурная, не магла мець шырока развітай літаратуры. Тое, што было створана, гэта было або памешчыцка-буржуазная літаратура, або фальклор. І толькі на хвалі першай рускай рэволюцыі 1905 года ўзняліся два буйнейшыя паэты сучаснай беларускай літаратуры, народныя паэты рэспублікі — Янка Купала і Якуб Колас. Колас, Купала — прадстаўнікі сялянства ў літаратуры па свайму паходжанню і па сувязі з працоўнымі — на этапе першай рэволюцыі адлюстроўвалі і яго рэволюцыйныя імкненні, і яго непасляслядоўнасць, і хістанні. Вершы Купалы і Коласа на гэтым этапе адыгралі вялікую станоўчую ролю, хоць паэты і тады не ўзняліся да разумення кіруючай ролі пролетарыята ў рэволюцыі, тым больш да разумення ролі нашай партыі.

Мы абавязаны асобна падкрэсліць, што Купала і Колас выдзяляюцца з усіх дакастрычніцкіх пісьменнікаў сваім талентам, сваёй вучобай у класікаў рускай літаратуры, у Пушкіна, у Некрасава, у Шэўчэнка сваёй культурай верша, блізасцю яго да народнага верша, што ў свой час было заўважана і падтрымана Алексеем Максімавічам Горкім.

Але чым далей пасля рэволюцыі 1905 года, тым больш было ў Купалы і Коласа вершаў з буржуазна - нацыяналістычным зместам.

Пад уплывам нацыяналістаў, пад уплывам «Нашай нівы» Якуб Колас у 1906 годзе, прапанаваўшы «перавешаць паноў», як сродак дабіцца зямлі, стаў апалагетам хутарской сістэмы гаспадаркі. І ў гэтым яшчэ раз сказалася дробнабуржуазная прырода паэта.

Тое-ж самае здарылася і з Янкай Купалай. Паэт-рэаліст, трыбун рэволюцыйнага сялянства пад уплывам нацыяналістаў з «Нашай нівы» кінуўся ад рэалізма к сімвалізму (гл. яго вялікія паэмы «Адвечная песня» і асабліва «Сон на кургане»). Нацыяналізм як змест, сімвалізм як форма глушаць вялікую паэзію Купалы. Вобразы яго трацяць рэльефнасць і матэрыяльнасць абрысоўкі, становяцца расплыўлівымі, абстрактнымі, мова аддаляецца ад народнай.

У той-жа перыяд у беларускую літаратуру прышлі два сучасныя пісьменнікі — Змітрок Бядуля і Цішка Гартны. Не гледзячы на тое, што Ц. Гартны прынёс у літаратуру рабочую тэматыку (адлюстроўваючы «настрої рамесніцкіх рабочых нашых мястэчак» **(Кнорын),** ён застаўся далёкім ад паэзіі рабочага калектыва. Сувязь-жа яго з «Нашай нівай» і нацыяналістычнай інтэлігенцыяй у Пецербургу ўзмацнілі яго нацыяналізм (гл. яго «Сявец», «Званар» і інш.).

Імперыялістычная вайна яшчэ больш узмацніла нацыяналістычна-ўпадніцкія настрої сярод беларускіх пісьменнікаў.

Такі беглы агляд дакастрычніцкай беларускай літаратуры. Мы прымаем з яе, як дэмакратычную спадчыну, лепшыя вершы Багушэвіча, у якіх ён пратэстуе супроць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання селяніна, мы прымаем прагрэсіўныя творы іншых пісьменнікаў, мы прымаем вершы Купалы, Коласа, народжаныя першай рускай рэволюцыяй. Мы адмятаем, як нягодны і шкодны, хлам, усякую спробу залічыць у спадчыну нацыяналістычную буржуазную дакастрычніцкую літаратуру.

Кастрычніцкая пролетарская рэволюцыя пад геніяльным кіраўніцтвам Леніна і Сталіна ўстанавіла пролетарскую дыктатуру — уладу Советаў, вызваліўшы народы для творчай работы ў брацкім Саюзе Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Але Совецкай Беларусі прышлося амаль пяць гадоў змагацца за права мірна працаваць над стварэннем новага шчаслівага жыцця: царскія генералы, беларускія нацыяналісты, нямецкія і польскія акупанты разам і ў паасобку, потым савінкаўскія і балаховіцкія банды прымушалі працоўных Беларусі разам з працоўнымі ўсёй Расіі ўпарта і гераічна абараняць незалежнасць Совецкай Беларусі.

Гэта барацьба вялася пад кіраўніцтвам нашай партыі, і ў гэтай барацьбе супроць усіх ворагаў рэволюцыі вырасла і загартавалася наша партыя большэвікоў Беларусі, створаная пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна. Яна вырасла і загартавалася перш за ўсё ў барацьбе супроць беларускай кулацка-памешчыцкай контррэволюцыі і яе паследкаў, у барацьбе за пролетарскі інтэрнацыяналізм, за стварэнне нацыянальнай па форме, пролетарскай па зместу культуры, у барацьбе за сацыялістычную індустрыялізацыю былога края вечных балот і лясоў, за сацыялістычную пераробку ўбогай і жабрацкай вёскі, так многа раз аплаканай у вершах і прозе дакастрычніцкай беларускай літаратурай.

Гіганты-заводы сёнешніх дзён, амаль паўтарастатысячны рабочы клас, калектывізацыя вёскі на 85 проц., росквіт культуры ўсіх народаў, насяляючых Беларусь, багатае, заможнае, культурнае, вясёлае жыццё, — вось што даў беларускаму народу слаўны шлях, пройдзены ім пад кіраўніцтвам ленінска-сталінскай партыі большэвікоў, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна.

Побач з дакастрычніцкімі пісьменнікамі пачынаў узнімацца маладняк новай, совецкай літаратуры. Ужо тады ў паэзіі прагучэла адданасць совецкай уладзе, удзяч насць Чырвонай арміі за вызваленне Беларусі, нянавісць да белапольскай арміі, упэўненасць у перамозе пролетарыята. Паэтам, які разгарнуў слаўную першую старонку пролетарскай беларускай паэзіі, быў Міхась Чарот, які даў буйнейшы твор гэтага перыяда — «Босыя на вогнішчы» (1922).

З другіх твораў М. Чарота трэба адзначыць паэму-фантазію «Чырвонакрылы вяшчун». Некалькі паэней, ужо ў канцы аднаўленчага перыяда, былі напісаны такія выдатныя паэмы, як «Ленін», «Марына» і іншыя.

З літаратурных фактаў гэтага перыяда трэба асобна адзначыць арганізацыю журнала «Полымя», у 1922 годзе, і журнала «Маладняк» — у 1923 годзе. «Полымя» стала цэнтрам арганізацыі нацыяналістычных сіл літаратуры. За спіной «Полымя» стаяла контррэволюцыйная нацдэмаўская арганізацыя.

«Маладняк», не гледзячы на неаднародны класавы склад арганізацыі і наяўнасць у ёй часткі нацдэмаўскай моладзі, адыграў вялікую станоўчую ролю ў аб'яднанні пісьменніцкай моладзі вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва.

І тут у «Маладняку» асабліва вырас Андрэй Александровіч.

Пачынаючы сваю паэтычную дзейнасць у 1920—21 гг., ён таксама аддаў даніну і форме і зместу «адраджэнчай» літаратуры, знаходзячыся пад моцным уплывам паэзіі Купалы. Аднак яго хутка выдзеліла сярод іншых паэтаў з іх выключна вясковай тэматыкай тэматыка совецкага горада. Ужо ў 1922 годзе ён надрукаваў рад вершаў з цыклу «Горад», у якім даў зарысоўкі совецкага горада. Гэтым-жа зарысоўкам прысвечаны вершы «Новы Менск».

У гады аднаўленчага перыяда Александровіч мае рад вершаў, прадаўжаючых галерэю партрэтаў рабочых ужо з вялікай мастацкай дасканаласцю. («Вартаўнік», «За іголкай»).

Александровіч змагаўся за сацыяльна-насычаную, палітычную лірыку, вучачыся гэтаму на лепшых творах Маякоўскага. У гэтым яго асноўная заслуга перад літаратурай БССР.

Рашэнне ЦК ВКП(б) (май 1925 г.), правільна арыентуючы ўсю партыю ў пытаннях літаратурнай палітыкі, папярэдзіла аб росце буржуазных настрояў у асяроддзі пісьменнікаў, аб выдзяленні пісьменніцкім асяроддзем ідэолагаў растучага кулацтва і новай буржуазіі. Гэта рашэнне разгарнула цэлую праграму дзеяння для таго, каб дабіцца гегемоніі пролетарскай літаратуры, вырошчваючы свае кадры і беражна перавыхоўваючы старых, ідучых да нас пісьменнікаў.

У асяроддзі «Маладняка» ішла жорсткая класавая барацьба. Пад відам барацьбы за «культуру» мовы, за «сапраўды мастацкі» твор і т. д. нацыяналістычная група імкнулася адарваць моладзь ад актыўнага ўдзелу ў жыцці рэспублікі, замкнуўшы яе ў кола вузка-літаратурных, часта фармальна стылістычных пытанняў, каб тым самым атручваць літаратурнае асяроддзе ядам нацыяналізма.

Але ў «Маладняку» ўжо выраслі кадры комуністаў - пісьменнікаў, якія пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б не толькі аднавілі «Маладняк», але і ператварылі яго ў БелАППІ. Актыўную ролю ў аднаўленні «Маладняка», у разгортванні яго работы і ператварэнні яго ў БелАППІ адыгралі комуністы-пісьменнікі Міхась Лынькоў, Платон Галавач, Рыгор Мурашка і іншыя. Аднак, разгортванне творчасці маладых магло адбыцца ў поўнай меры толькі пасля разгрому нацыяналістаў.

Гэта адбылося ў 1929—30 гг., калі была выкрыта контррэволюцыйная арганізацыя нацдэмаў, калі былі выкрыты Ігнатоўскі, Баліцкі, Прышчэпаў, калі рад нацыяналістаў-пісьменнікаў і крытыкаў — Бабарэка, Чаржынскі, Пушча, Дубоўка, Мрый, Гарэцкі— былі выкрыты як адны з самых актыўных удзельнікаў контррэволюцыйнай арганізацыі, калі былі раскрыты нацыяналістычныя памылкі такіх пісьменнікаў, як Бядуля, Гурло, Зарэцкі, Жылуновіч, Колас, Купала і іншыя.

Гіганцкія перамогі сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і вёсцы, мудрая выхаваўчая палітыка партыі, разгром нацыяналістаў прымусілі Купалу і Коласа парваць з нацыяналістычным мінулым і асудзіць яго. І Купала, і Колас актыўна ўключыліся ў практыку сацыялістычнага будаўніцтва, сталі распрацоўваць совецкую тэматыку, стварылі рад высокамастацкіх літаратурных твораў. Той-жа шлях прарабіў і рад іншых пісьменнікаў, якія прыступілі да сваёй ідэйнай перабудовы (Бядуля, Гартны і інш.).

Перад вачыма пісьменніка за апошнія пяць гадоў быстрымі, небывалымі да таго тэмпамі, разгортваліся падзеі велізарнай гістарычнай важнасці, вялікія справы і дні двух большэвіцкіх пяцігодак, з якіх першая пабудавала фундамент сацыялістычнай эканомікі, другая паставіла сабе задачай (і з поспехам яе выконвае) пабудаваць сацыялістычнае бясклассавае грамадства. Перад вачыма пісьменніка разгортвалася астрэйшая класавая барацьба, у рэзультаце якой аказаўся ліквідаваным, на базе суцэльнай калектывізацыі, клас кулацтва, апошняя апора і надзея капіталізма. Перад літаратурай ва ўсю велічыню паўстала задача паказаць арганізатарскую і выхаваўчую ролю партыі і яе правадыра таварыша Сталіна — нястомнага і непахіснага кіраўніка, настаўніка, друга, натхніцеля мільённых мас у барацьбе за комунізм.

І беларуская совецкая літаратура ў гэтым многа паспела. Былі створаны такія творы, як «Адшчапенец» і «Дрыгва» Якуба Коласа, як «Над ракою Арэсай» Янкі Купалы, «Напор» і «Шчаслівая дарога» Александровіча, «На чырвоных лядах» і «Баян» М. Лынькова, «Качагары» Ілы Гурскага, «Спалох на загонах» Галавача, «Міжбур'е» і «Контр-атака» Курдзіна, «Мост» Рамановіча, «Бацькаўшчына», «Трэцяе пакаленне» Кузьмы Чорнага, «Канец дружбы», «Мядзведзічы» Крапівы, «Тэорыя Каленбрун» і «Сержант Дроб» Самуйлёнка, «1914 год» і інш. вершы П. Броўкі, «Мужнасць» і інш. вершы Глебкі, «Зельменяне» М. Кульбака, «На чужым піры» Ізі Харыка, «Сям'я Варанцовых» В. Кавальскага і рад іншых.

Асаблівы рост нашай літаратуры, як, напэўна, і ўсіх нацыянальных літаратур, мы маем пасля гістарычнага рашэння ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1932 г., калі партыя ліквідавала арганізацыйныя формы БелАППІ, стаўшыя са сродку збірання пролетарскіх сіл літаратуры тормазам яе далейшага развіцця. Гэта рашэнне паскорыла канчатковы і беспаваротны пераход на бок пролетарыята ўсяго, што ёсць сапраўды таленавітага ва ўсіх пісьменніцкіх арганізацыях. Мы не можам сказаць, што мы дасягнулі занадта вялікіх поспехаў у гэтай галіне, хоць безумоўныя поспехі мы маем.

Не маючы магчымасці прадэманстраваць на прыкладзе ўсіх твораў, вышаўшых за апошнія годпаўтара, рэзультаты гэтай барацьбы за якасць, якая разгарнулася пасля ўсесаюзнага з'езда пісьменнікаў, я хацеў-бы сказаць некалькі слоў аб тых з іх, у якіх дасягнуты станоўчыя рэзультаты асабліва цікавым для нас чынам.

Да такіх твораў я перш за ўсё хачу аднесці навелы т. Лынькова («Баян», «На вялікай хвалі», «Сінія галіфэ» і інш.). Яны цікавы перш за ўсё тым, што авеяны вялікай любоўю да чалавека, які будуе сацыялізм і разам з гэтай будоўляй змяняе сябе, перавыхоўваецца, ачышчаецца ад скверны капіталістычнага мінулага.

У Лынькова прыгожая, блізкая да народнай мова і цёплы гумар. Гэта асабліва ярка відаць у рамане «На чырвоных лядах» і ў яго апошніх трох аповесцях для дзяцей.

Некалькі слоў аб дзіцячай літаратуры. Апошні год быў-бы асабліва бедны ў гэтай галіне літаратуры, калі-б не вышэйназваныя тры аповесці Міхася Лынькова. Праўда, папярэдні год быў асабліва ўраджайным. У мінулым годзе вышла паэма Александровіча «Шчаслівая дарога», паэма Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды», вышла «ТВТ» — надзвычайна карысная і цікавая кніга Янкі Маўра, вышла кніга Якімовіча «Незвычайны мядзведзь», вышаў рад кніг на яўрэйскай мове, у тым ліку паэма Ізі Харыка «Ад полюса к полюсу».

Нарада па дзіцячай літаратуры пры ЦК ВКП(б), выступленне тав. Андрэева, т. Косарэва ўзнімае пытанне аб дзіцячай літаратуры на новую, вышэйшую ступень, і гэта абавязаны ўлічыць нашы пісьменнікі.

Апошнія раманы — П. Галавача («Праз гады»), К. Чорнага («Трэцяе пакаленне») — ставяць яшчэ раз перад літаратурай пытанні сюжэтнасці і ў яшчэ большай меры пытанні глыбокага ведання матэрыялу.

Вялікім майстрам псіхалагічнага рамана паказаў сябе Кузьма Чорны ў «Трэцім пакаленні». Калі раней Кузьма Чорны бачыў перад сабой ізаляванага абстрактнага чалавека і ізаляванае душэўнае жыццё яго «вне дел» (па вядомаму выражэнню Леніна, г. зн. па-за сацыяльнай практыкай), то цяпер К. Чорны бачыць тую сацыяльную практыку, якая служыць асновай псіхалагічных канфліктаў яго герояў. Пісьменнік, па геніяльнай фармулёўцы таварыша Сталіна, ёсць інжынер чалавечых душ: «Зазірнуць у душу сваіх герояў», а не абмежавацца паказам іх знешняй дзейнасці — пад відам барацьбы супроць буржуазнага псіхалагізма — вось той цяжкі, але неабходны шлях, па якому пашлі К. Чорны, Галавач, Лынькоў і інш.

Аднак, наша літаратура, як і руская літаратура, ведае прыклады і так званых бессюжэтных або слаба сюжэтных твораў, якія сцементаваны вялікай ідэяй і з асобных навел, з шматкоў, «з самародкаў», узятых з жыцця і ўпраўленых у тканіну мастацкага вымыслу — атрымліваецца вялікае каштоўнае палатно. Такавы «Мядзведзічы» К. Крапівы, такавы «На чырвоных лядах» Лынькова, рад аповесцей Мікуліча, дзве аповесці Шынклера і інш.

Зразумела, усё гэта магчыма толькі ў тым выпадку, калі пісьменнік ведае жыццё не толькі з кніг, бачыць жыццё не толькі з акна вагона, а калі ён прымае актыўны ўдзел у практыцы сацыялістычнага будаўніцтва.

Неабходна максімальна павысіць вучобу нашых пісьменнікаў, вучобу палітычную, вучобу літаратурную, вучобу ў лепшых пролетарскіх пісьменнікаў, у Алексея Максімавіча Горкага, у класікаў рускай літаратуры. У вучобе мы вельмі і вельмі адстаем, асабліва па лініі моладзі.

Праўда, наша моладзь — Самуйлёнак, Мікуліч, Куляшоў, Шынклер, Агняцвет, Пізавараў — сваімі апошнімі кнігамі і асобнымі творамі моцна шагнула наперад у сэнсе ідэйнага і мастацкага росту.

У гэтым годзе тав. Мікуліч пабываў з групай пісьменнікаў у Грузіі і напісаў на матэрыялах Грузіі невялікую аповесць «Дружба», якая, не гледзячы на некаторую спешку, на мой погляд, з'яўляецца каштоўным укладам у беларускую літаратуру як па сваіх мастацкіх якасцях, так і па тым, што з'яўляецца першай мастацкай кніжкай, якая знаёміць беларускага чытача з жыццём брацкіх народаў Саюза праз мастацкае слова. Гэтай-жа справе служылі вершы нашага паэта Хведаровіча і нарысы таленавітага празаіка Самуйлёнка.

У «Полымя рэволюцыі» і ў ЛіМ'е за апошні год надрукаваны і апавяданні раду пачынаючых маладых пісьменнікаў: В. Кандрацені, М. Гвяздова, Е. Садоўскага, А. Стаховіча, М. Сяднёва, чэлюскінца Міронава, Вл. Глазырына і Ал. Шарапава.

Маладая пролетарская драматургія пад кіраўніцтвам партыі правяла вялікую барацьбу супроць напыяналістычнай драматургіі. У барацьбе за пастаноўку перакладаў пролетарскіх п'ес, перакладзеных з рускай і іншых моваў, супроць чаго асабліва заядла пярэчылі нацдэмы (успомнім тэатральную дыскусію 1927 г.), за пастаноўку першых буйных тво-

ПРАЦЯГ ДАКЛАДА тав. КЛІМКОВІЧА НА 2 СТАР.

На пленуме праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў СССР. Група дэлегатаў. Злева направа: тт. Алі Нізам (Азербайджан), Шырабон (Бурата-Манголія), Гейроці (Узбекістан), Мутвік (Азербайджан) і Змітрок Бядуля.

Фото Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

ПРАЦЯГ ДАКЛАДА тав. КЛІМКОВІЧА

раў пролетарскай драматургіі «Гуты» Рыгора Кобена і «Качагары» Іллі Гурскага перамагла пролетарская драматургія, і нацыяналісты былі выкінуты з тэатраў.

Абедзве п'есы — Кобеца і Гурскага—прайшлі з велізарным поспехам, выклікаючы шалёную злобу ворагаў. Следам за гэтымі п'есамі былі пастаўлены «Мост» Рамановіча, «Міжбур'е» і «Контр-атака» Курдзіна. Была пастаўлена п'еса «Напор» Александровіча. Рабочая тэматыка, вобразы рабочых моцна заваявалі беларускую сцэну, чаго нельга, на жаль, сказаць аб усёй нашай літаратуры. Лепшыя п'есы Совецкага Саюза былі перакладзены на беларускую мову і пастаўлены ў нашых тэатрах. Пасля ўсесаюзнага з'езда мы паставілі дзесяць вялікіх арыгінальных п'ес у нашых тэатрах, зараз усе драматургі працуюць над новымі п'есамі да дваццацігоддзя совецкай улады.

***

У брацкай сям'і літаратур БССР, дапамагаючы адна другой, супольна змагаючыся за ленінска-сталінскую палітыку і супроць ворагаў яе — нацыяналістаў усіх масцей, супольна змагаючыся за высокае мастацтва літаратуры, растуць і развіваюцца яўрэйская, польская, літоўская і руская літаратуры БССР. Мы маем безумоўна бурны рост яўрэйскай і польскай літаратуры, некаторую стабілізацыю складу рускіх пісьменнікаў і ўпэўнены ход наперад многіх з іх (Шапавалаў, Глазырын, Баранаў, Крапачоў).

У гэтым годзе належыць павіншаваць Ізі Харыка не толькі з 15-гадовым юбілеем творчасці, але і з выдатнай паэмай «На чужым піры», у якой з велізарнай сілай дан вобраз месцачковага музыкі, зацкаванага кагальным асяроддзем, вобраз старога мястэчка царскай Расіі.

Таксама можна павіншаваць Кульбака як са сканчэннем 2 тома «Зельменяне», так і з п'есай.

Тав. Тэйф у гэтым годзе выдаў кнігу вершаў «Пролетарка — сястра мая», паэму аб хлопчыку, які выратаваў цаною ўласнага жыцця атрад чырвонаармейцаў.

Буйным дасягненнем яўрэйскай совецкай лірыкі з'яўляецца апошняя кніга вершаў З. Аксельрода («І зноў вершы»).

Трэба асобна адзначыць, як вялікую заслугу, пераклад вершаў Янкі Купалы на яўрэйскую мову тав. Аксельродам (выдана цэлая кніга да юбілею).

Цікава паэтычная работа Камянецкага, які насычае сваю страфу гераічнай рамантыкай.

Таксама цікавай з'явай у літаратурным жыцці быў «Агітпоезд» тав. Даўгапольскага, як вопыт аб'яднаць нарысавыя накіды сваіх твораў аб перабудоўваючайся вёсцы з фабульным апавяданнем.

Нам, літаратуры пагранічнай рэспублікі, вы, таварышы, мабыць паставіце пытанне: ці не забылі вы, таварышы, абарону краіны, абарону Совецкага Саюза, заходнім фарпостам якога з'яўляецца Совецкая Беларусь?

Гэту адказнасць за крэпасць «браніраваных граніц» (Александровіч) усведамляюць самі пісьменнікі.

За два гады ў беларускай літаратуры з'явіліся 24 кніжкі з ваеннай тэматыкай: 5 альманахаў «Атака», 2 альманахі «Байцы», «Браніраваныя рубяжы» Кручкіна, зборнік «Баявыя будні», кнігі вершаў «Дзяржынцы» і «Большэвікі граніцы» — раман Шапавалава, зборнік вершаў Шарапава «Маршавы крок» і «Дзве сустрэчы», Хадыкі «Чырвонаармейская лірыка», Ліманоўскага кніга расказаў аб Чырвонай арміі, Глазырына «Разведчык Коля», Садоўскага «Скрынка і ордэн»... Апрача таго, за апошнія два гады досыць грунтоўна распрацоўваліся тэмы, звязаныя з імперыялістычнай вайной 1914—1917 гг. Тут трэба назваць «На шляхах волі» Якуба Коласа, «Набліжэнне» раман Зм. Бядулі, «1914» П. Броўка, «Герой нацыі» Эд. Самуйлёнка.

І ўсё-ж увагі да абарончай літаратуры яшчэ няма ў такой меры, у якой гэта нам патрэбна.

***

Вы таксама ў праве спытаць нас, беларускіх літаратараў, ці цікавімся мы жыццём той часткі беларускага народу, якая пакуль яшчэ знаходзіцца пад уладай польскага памешчыка і жандара, ці цікавімся мы заходне-беларускай літаратурай. Пытанне гэта законнае. І мы адказваем на яго. Так, цікавімся, думаем пра яго, хоць не так многа, як трэба было-б. Заходняй Беларусі прысвечана «Пагранічная вясна» Александровіча. Заходняй Беларусі прысвечан рад вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа. Наш байкапісец Кандрат Крапіва «праехаўся па зубах» беларускіх нацдэмаў Заходняй Беларусі выдатнай сатырай «З фашысцкай падворотні». Есць вершы аб Заходняй Беларусі і ў т. Глебка, і ў т. Чарота.

Амаль нічога няма аб Заходняй Беларусі ў прозе, за выключэннем апавяданняў З. Бядулі.

Заходняй Беларусі прысвечан фільм «Да заўтра», які паказвае лёс беларускай школы ў Заходняй Беларусі.

Як бачыце, мала, вельмі мала.

Што датычыць заходне-беларускіх пісьменнікаў, то іх надта мала. Становішча з літаратурай там намнога горш, чым было ў Беларусі ў часы царызма. Мы не можам паскардзіцца на адсутнасць жадання пісаць, такое жаданне ёсць у многіх. А вось аб «магчымасці» пісаць мне расказваў адзін таварыш з Заходняй Беларусі: рабочага паэта пасадзілі ў турму за рэволюцыйныя вершы; каб прымусіць яго кінуць пісаць, яму не перадаюць у турму ні кніг, ні алоўка, ні паперы. І таварыш творыць свае вершы ў галаве, ціхенька дэкламуе іх, каб добра запомніць і напісаць тады, калі выйдзе праз тры гады з турмы.

***

Калі параўнаеш жыццё ў Заходняй Беларусі з нашым жыццём, з нашымі дасягненнямі, з нашымі перспектывамі, яшчэ больш рэльефна стане найглыбейшая бездань паміж светам капіталізма і светам социялізма.

Якія прасторы, якія магчымасці раскрыла перад літаратурай дыктатура пролетарыята і мудрае кіраўніцтва КП(б)Б! Заможнае, вясёлае калгаснае жыццё ў вёсцы, такое-ж заможнае, такое-ж вясёлае і культурнае ў горадзе, адсутнасць чорных клопатаў аб заўтрашнім дні, абы чэсна працаваў, усё астатняе прыкладзецца — усё гэта заснавана на сталёвым фундаменце нашых гаспадарчых поспехаў, на социялістычнай індустрыялізацыі, на механізацыі социялістычнага земляробства. Якога-ж больш фундамента жадаць для нашай жыццерадаснай літаратуры? Гэта багацейшая глеба, якая здольна вырасціць найлепшыя мастацкія творы.

Краіна социялізма — гэта ёсць найбольш спрыяючае асяроддзе для росту індывідуальнай творчасці, нажіраванай на карысць усяго калектыва, тым больш творчасці літаратурнай. Велізарная ўвага партыі і ўрада, велізарныя клопаты рабочых мас, шчырая любоў, якімі гэтыя масы акружаюць пісьменніка аж да жадання падказаць: прыходзьце да нас — у нас выдатныя людзі, у нас сталёвы паток новых людзей, які не толькі ламае старыя тэхнічныя нормы вытворчасці, але які пераплаўляе чалавека, робіць яго членам комуністычнага грамадства. Прыходзьце да нас, таварышы пісьменнікі, бярыце цэлыя кавалкі прыгожага жыцця, апрацоўвайце іх з такім-жа рвеннем, з такім-жа веданнем тэхнікі і з такой-жа радасцю, як гэта робім мы, стахановцы — перадавыя людзі сталінскай эпохі. І тады вы, таварышы пісьменнікі, створыце сапраўды цудоўныя творы. Увага да чалавека, асядлаўшага тэхніку, павінна стаць асноўным лозунгам літаратуры. Стахановцы—людзі новага пакрою, людзі сталінскага гарту, заваёўваючы галіну за галіной у вытворчасці, яны не могуць не з'явіцца і ў галіне літаратуры ў аболвух планах — і ў якасці герояў літаратуры і ў якасці герояў-літаратараў. Да выканання гэтай задачы заўсёды аб'яднаная баявым пролетарскім інтэрнацыяналізмам, аб'яднаная вялікай дружбай народаў СССР пад сцягам партыі Леніна—Сталіна, будзе крочыць вялікая ўсесаюзная літаратура і ў яе радах — яе родная дачка — совецкая беларуская літаратура.



Таджыкскія пісьменнікі ў рэдакцыі «Звязды». Справа налева: тт. Гані Абдула, Юртаеў, Дзіхаці. Фото П. Н. КУРСЕВІЧА.

ТЭАТР І ДРАМАТУРГІЯ СОВЕЦКАЙ БАШКІРЫІ

Тэатр і драматургія Башкірыі нарадзіліся з Кастрычнікам, у агні баёў за яго. Першы башкірскі драмгурток, які іграў на роднай мове, узнік у 1917 годзе. Башкірская драматургія вядзе свой пачатак з 1919 г. Першыя п'есы пісаліся ў разгары грамадзянскай вайны, пераважна для Чырвонай арміі, для садзейнасці ёй.

Прайшло больш дзесяці гадоў. На 1 ўсесаюзную алімпіяду совецкага тэатра прыехаў малады яшчэ башкірскі тэатр. Ён даў глядачу дзве п'есы — нацыянальную і класічную. Апошняя гучэла значна слабей. У значнай меры фальклорны матэрыял нацыянальнай драматургіі лягчэй паддаваўся трактоўцы маладымі акторамі.

Яшчэ пяць год і летам 1935 г. той-жа тэатр, стаўшы ўжо Дзяржаўным акадэмічным тэатрам Башкірскай АССР, зноў прыехаў у Маскву, ужо на індывідуальныя гастролі. Тэатр безумоўна мацнее ў трактоўцы башкірскай драматургіі. Але асаблівай удачай яго тэатральная грамадскасць Масквы аднадушна прызнала «Отэло» Шэкспіра. Гэта быў спектакль сапраўднай тэатральнай культуры, які паказаў ва ўсім блеску імклівa растучых майстраў башкірскай сцэны. «Отэло» — знамянальная веха для башкірскага тэатра, сведчанне пераходу яго да перыяда творчай спеласці, выхаду з рамак фальклорнай абмежаванасці на шырокую дарогу сусветнага рэпертуару.

Башкірскі тэатр высунуў ужо цэлы рад спелых талентаў, як народныя артысты **Муртазін, Магадзееў, Манчажаў, Зубаіраў,** артысты **Файзі, Бекбулатава** і інш. Далейшы рост іх немагчымы без адначасовага росту башкірскай драматургіі. Між тым, адзін з буйнейшых артыстаў Башкірскай АССР нядаўна заявіў у друку, што нацыянальная драматургія не дае тэатру поўнацэннага матэрыялу.

Ці верна гэта? Совецкая Башкірыя налічвае цэлы рад драматургаў. Буйнейшыя з іх — Афзал **Тагіраў,** старшыня ЦВК Башкірскай АССР, і Дауд **Юлты.** П'есы Юлты да гэтага часу былі прысвечаны пераважна мінуламу, гераічнай барацьбе башкірскага народу з царызмам і «ўласнымі» эксплататарамі. Драматургія А. Тагірава (вельмі абшырная, бо ім напісана 27 п'ес) амаль што цалкам трактуе баявыя пытанні сучаснасці. Яго п'есы «Ала-Тау», «Ўрняк», «17—30», «Сібірак Гільман» і інш. зрабілі поўны пераварот у сэнсе накіраванасці башкірскага тэатра. Іменна на іх матэрыяле башкірскія артысты вучыліся ствараць вобразы башкірскіх рабочых, калгаснікаў, комуністаў і комсамольцаў, совецкіх інтэлігентаў, а таксама розных прадстаўнікоў класава-варожых праслоек. А Тагіраў вывёў на башкірскую сцэну велізарную галерэю людзей сучаснасці. Чоткая большэвіцкая яго ўстаноўка п'ес (А. Тагіраў—большэвік з 1918 года) адыграла буйнейшую ролю ў разгроме буржуазна-нацыяналістычных канцэпцый унутры башкірскага тэатра. П'есы Тагірава сапраўды большэвізавалі башкірскую сцэну. У гэтым іх велізарнае і сапраўды гістарычнае значэнне для башкірскага тэатра і літаратуры.

Але, улічваючы гэта, нельга не прызнаць, што на п'есах Тагірава ляжыць пячатка неадпрацаванасці ў сэнсе драматургічнай жампазіцыі і распрацоўкі характараў. Безумоўна, тут адыгрывае ролю велізарная перагружанасць аўтара важнейшай дзяржаўнай работай. Але так ці інакш прэтэнзіі майстраў башкірскага тэатра да сваіх драматургаў трэба прызнаць правільнымі. Тэатр, які можа дасканала, своеасабліва сыграць такі шэдэўр сусветнага рэпертуару, як «Отэло», мае права патрабаваць ад драматургаў-сучаснікаў поўнацэнных твораў. Між тым, недахопы, уласцівыя п'есам буйнейшага драматурга Башкірыі А. Тагірава, у той ці іншай меры ўласцівы ўсёй башкірскай драматургіі. На сёнешнім этапе развіцця совецкага тэатра ад драматургаў трэба патрабаваць не толькі ідэйнай чоткасці, не толькі правільнасці светапогляду, але і найглыбейшага раскрыцця чалавечай псіхікі, майстэрскага ўладання ўсім арсеналам драматургічнай тэхнікі, словам,—усяго таго, што ўпчыльную наблізіла-б нашу драматургію да ўзроўню класічных твораў.

Першай умовай для дасягнення гэтага з'яўляецца сяброўская, але актыўнейшая крытыка і самакрытыка ўсёй совецкай драматургіі ў цэлым.

Трэці пленум праўлення ССП, які адбываецца ў Менску, павінен спрыяць росту драматургіі не толькі ў Беларусі і Башкірыі, даклады якіх стаяць на павестцы дня, але і ва ўсёй нашай краіне, якая ўжо многа гадоў трымае за сабой неаспрэчнае сусветнае першынства ў галіне тэатра.

АНАТОЛІЙ ГЛЕБАЎ.

Кіраўнік групы самадзейнага рэпертуару драмсекцыі ССП СССР.

Сталіца, дастойная ордэнаноснай рэспублікі

Пролетарскі паэт тав. **А. Безыменскі** ў гутарцы з нашым супрацоўнікам падзяліўся сваімі ўражаннямі аб нашай ордэнаноснай рэспубліцы і яе сталіцы.

— Быў я ў Менску ў часе імперыялістычнай вайны, — гаворыць паэт.—Гэта было ў 1916 годзе. Менск тады быў «замардаваны гарадзішка», які баяўся не столькі самой вайны, колькі паноў-афіцэраў і ўсёй зграі вайсковых драпежнікаў, якімі горад быў запруджан у тыя часы. Гэта быў горад цэркваў, чыноўнікаў, горад асаблякоў буржуазіі і хібрак беднаты, — тыповая «акраіна» імперыі Расійскай...

І калі я цяпер убачыў Менск, калі прыехаў сюды на пленум, мне здавалася, што не ў той горад я трапіў: да таго Менск змяніў сваё аблічча. Горад яўны распраўляе свае плечы, вызваліўшыся ад цяжкага ярма...

Велічэзныя дамы і кварталы, вялікае ўрадавае, жыллёвае і культурнае будаўніцтва літаральна на

Тав. А. Безыменскі

вачах ператварылі Менск у дастойную сталіцу ордэнаноснай Беларусі, ставяць яго ў першыя рады сталіц вялікага Совецкага Саюза.

Той факт, што наш пленум сабраўся ў Менску, лішні раз даказвае, што няма і не можа быць у Совецкім Саюзе «акраіны», яшчэ раз пацвярджае правільнасць і трыумф нацыянальнай палітыкі партыі **Леніна—Сталіна.**

Гаворачы аб процілегласці паміж становішчам квітнеючай Совецкай Беларусі і голадам і галечай працоўных у Заходняй Беларусі, тав. **Безыменскі** сказаў:

— Мне давялося ў Варшаве прачытаць прамову аднаго польскага міністра. Пан міністар вымушан быў сказаць хоць крыху праўды аб жудасным становішчы сялянства Заходняй Беларусі, чые жабрацкія, апустошаныя вузкія палоскі ляжаць па той бок мяжы ад квітнеючых масіваў нашых калгасных палёў.

Пан міністар заявіў, што становішча сялянства ў Совецкай Беларусі па свайму добрабыту настолькі адрозніваецца ад становішча ў Заходняй Беларусі, што калі не будуць прыняты якія-небудзь меры, то «эманацыя комунізма, выходзячая з Усхода, прынясе пануючым класам Польшчы незлічоныя непрыемнасці».

Дакладна і ясна. Наўрад-ці трэба каментаваць.

Тое, што так палохае пана міністра, насычае шчасцем і гордасцю гераічны народ Совецкай Беларусі і ўсе народы Совецкага Саюза.

Дзівосныя багацці нацыянальнай культуры працоўных Беларусі ўзбагачаюць усе праяўленні культурнага жыцця беларускага народу. Адсюль ідуць і карэнні непарушна звязанай з народам совецкай беларускай літаратуры.

Рознастайнасць і багацце талентаў, нястрымны размах і напор іх творчасці дазваляюць мне з вялікай радасцю пераканацца ў тым, што ў разгортваючымся спаборніцтве паэтаў Совецкага Саюза на лепшы твор да дваццатай гадавіны вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі паэзія Совецкай Беларусі дасць найлепшыя ўзоры паэтычнай творчасці.

Замежны друк аб канфліктах на Далёкім Усходзе

ПАСЛЯДОЎНАЯ ПРАВАКАЦЫЯ

ПАРЫЖ, 9 лютага. (БЕЛТА). Усе газеты змяшчаюць паведамленні аб прасоўванні японска-манчжурскіх войск к граніцам Манголіі, падкрэсліваючы ў загалоўках сур'ёзнасць гэтых дзеянняў японска-манчжурскай ваеншчыны. Орган партыі социялістаў «Попюлер» змяшчае гэтыя паведамленні пад загалоўкам: «Прамая пагроза Совецкаму Саюзу». У артыкуле па гэтаму поваду газета піша:

«Метад правакацыі ўжываецца японцамі з паслядоўнасцю, якая пацвярджае іх імкненні да агрэсіі... Совецкі Саюз са свайго боку робіць усё, каб унікнуць вайны. Совецкі Саюз ужо даказаў гэту сваю мірную палітыку на Далёкім Усходзе продажам Кучі, вытрыманасцю, якую ён праявіў, калі Японія ажыццяўляла захваты ў Манчжурыі, у Паўночным Кітаі, у Жэхэ і ў Чахары.

Аднак, ці дазволіць Совецкі Саюз японцам абаснавацца ў Знешняй Манголіі і тым самым даць ім магчымасць у будучым праводзіць аперацыі ў напрамку Улан-Батора, Кяхты, Верхнеудзінска, каб перарэзаць сібірскую магістраль і ізаляваць такім чынам Далёкі Ўсход ад астатніх частак Совецкага Саюза».

ЯПОНІЯ ІГРАЕ З АГНЁМ

ПАРЫЖ, 9 лютага. (БЕЛТА). Друк з найвялікшым абурэннем і яўным непакоем каментуе новую выхадку японска-манчжурскай ваеншчыны. Асноўны сэнс каментарыяў прэсы заключаецца ў наступным: Японія іграе з агнём, прычым пажар, які яна раздувае ў Азіі, можа мець найцяжэйшыя вынікі ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Еўропе.

Газета «Эвр», змяшчаючы паведамленне аб адціраўпы японска-манчжурскіх часцей к граніцам Мангольскай народнай рэспублікі, піша:

«Не трэба забываць таго, у чым заключалася японская палітыка за апошнія гады: паглынанне Манчжурыі і пагрозы па адрасу Совецкага Саюза. Мы з цепакоем пытаем сябе, які яшчэ сюрпрыз нам рыхтуе японскі імперыялізм».

Газета «Эр нувель», указваючы, што сваімі дзеяннямі Японія, як відаць, ставіць сабе мэтай захват Манголіі, піша: «Аднаўленне японскага прасоўвання на гэты раз у напрамку Байкала прадстаўляе прамую пагрозу Совецкаму Саюзу. Гэта прасоўванне адбываецца як раз на другі дзень пасля абвяржэння паведамлення аб заключэнні сакрэтнага германа-японскага дагавору і звароту з Масквы дэлегацыі мангольскага народнага ўрада, якой у Маскве былі даны парады захоўваць асцярожнасць і ўпэўненасць. У Лондане паведамленне аб японскай агрэсіі супроць Манголіі выклікае непакой і апасенні таго, што гэта чарговая правакацыя можа пацягнуць за сабой цяжкія ўскладненні».

Выкрыццё японскай выдумкі

УЛАН-БАТОР, 10 лютага. (БЕЛТА). Тут атрыманы весткі аб тым, што такійская газета «Ніці-ніці» апублікавала тэлеграму свайго харбінскага карэспандэнта аб меўшым нібыта месца 8 лютага г. г. нападзе 600 мангольскіх салдат у раёне Келемуту на японскую пагранічную яхову і аб тым, што ў рэзультаце бою пры гэтым нападзе абодва бакі панеслі цяжкія страты.

У мясцовых урадавых колах катэгарычна заяўляюць, што гэта паведамленне ад пачатку да канца выдумана. Ні ў раёне Келемуту, ні на якім-небудзь іншым участку граніцы МНР 8 лютага г. г. ніякіх сутычак не было.

Апошняя сутычка з японска-манчжурскімі войскамі мела месца 9 лютага г. г. у 17 гадзін за 200 кілометраў на паўднёвы усход ад Келемуту, а іменна—у раёне Булун-Дэрсу, каля возера Буір-нор і заключалася ў тым, што японска манчжурскі атрад на 6 грузавіках і адной легкавой машыне ўварваўся на тэрыторыю МНР і, абышоўшы з тылу пагранзаставу МНР, прабаваў захапіць табун коней, якія належалі заставе, відаць, для таго, каб затым напасці на самую заставу.

Агнём мангольскіх пагранічнікаў нападаўшыя былі, аднак, адагнаны і хутка даліліся ў напрамку к граніцы.

Такім чынам, паведамленне аб сутычцы 8 лютага ў раёне Келемуту не мае пад сабой ніякай падставы. Дакументальна устаноўлена, што **намаганні МНР былі накіраваны і астаюцца накіраванымі і зараз на ўнікненне падобных сутычак; наадварот, японская ваеншчына безупынна правакуе адну пагранічную сутычку за другой,** урываючыся на тэрыторыю МНР углыб часамі на 2 клм. і больш, як гэта, напрыклад, мела месца ў раёне возера Хара-нор, нападаючы на пагранзаставы МНР, знішчаючы пагранічныя знакі і т. д. Кожны з гэтых разбойніцкіх нападаў японскі друк імкнецца затым паказаць, як абарону Манчжоу-Го ад нападаў, меўшых нібыта месца з боку мангольскіх часцей.

Правакацыйную выдумку японскай ваеншчыны ў улан-баторскіх паінфармаваных колах тлумачаць тым, што японская ваеншчына мае патрэбу, відаць, у аргументах для апраўдання падрыхтоўваемых ёю новых і больш буйных правакацый на мангольскай граніцы. Аб тым, што такая злачынная падрыхтоўка мае месца, сведчыць **правадзімае зараз сканцэнтраванне японскіх і манчжурскіх ваенных часцей на ўсходняй граніцы МНР.** Аб гэтым, у прыватнасці, і паведамляе харбінскі карэспандэнт «Ніці-ніці».

АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

У сувязі з паведамленнем японскага тэлеграфнага агенцтва «Домей цусін», што Японія і Манчжоу-Го вядуць перагаворы з СССР аб дэмаркацыі (пераглядзе) совецка-манчжурскіх граніц, ТАСС упаўнаважан заявіць, што гэта паведамленне не адпавядае сапраўднасці.

ПРАБЫВАННЕ ТАВ. ТУХАЧЭЎСКАГА У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 10 лютага. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе: «Намеснік народнага камісара абароны СССР, маршал Совецкага Саюза Тухачэўскі прабудзе ў Парыжы адзін ці два дні, на працягу якіх наведае ваеннага міністра, міністра авіяцыі і міністра морскага флота Францыі.

Сёння Тухачэўскі меў сустрэчу з начальнікам генеральнага штаба французскай армії генералам Гамеленам, які запрасіў яго на сняданне. Заўтра Тухачэўскі сустрэнецца з начальнікам генеральнага штаба морскага флота віцэ-адміралам дэ-Дран-вілем і начальнікам генеральнага штаба авіяцыі генералам Пюжо.

***

ПАРЫЖ, 10 лютага. (БЕЛТА). Сёння намеснік народнага камісара абароны СССР маршал Совецкага Саюза Тухачэўскі наведаў ваеннага міністра генерала Морэна, з якім гутарыў каля поўгадзіны.

На сняданні, наладжаным начальнікам генеральнага штаба французскай армії генералам Гамеленам у гонар Тухачэўскага, прысутнічаў увесь кіруючы састаў французскага генеральнага штаба, а таксама ваенны аташэ СССР Венцоў і ваенна-паветраны аташэ СССР Васільчэнка.

ПЕРАД АБМЕРКАВАННЕМ СОВЕЦКА-ФРАНЦУЗСКАГА ДАГАВОРУ

ПАРЫЖ, 10 лютага. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе:

«Заўтра ў поўдзень у палаце дэпутатаў пачнецца абмеркаванне франка-совецкага дагавору аб узаемнай дапамозе, падпісанага 2 мая 1935 года Лавалем і Нацёмкіным, які будзе прадстаўлен на ратыфікацыю парламенту. Спрэчкі зойм'уць некалькі пасяджэнняў з прычыны таго, што ў спіс унесены ўрад аратараў, у тым ліку Эрыо, Блюм, Фландэн, Бонкур.

Торэз выступіць з дакладам аб ратыфікацыі, у якім прывядзе важнейшыя характэрныя рысы дагавору, які прадстаўляе сабой «істотную частку праекту усходняга пакту, які з'яўляецца рэзультатам сумеснай ініцыятывы французскай і совецкай дыпламатыі і мае на ўвазе пашырэнне на Усходнюю Еўропу сістэмы калектыўных гарантый, устаноўленай у Заходняй Еўропе лакарнскім дагаворам».

ІТАЛА-АБІСІНСКАЯ ВАЙНА

Бездарожжа паўночнай часткі Абісініі вельмі затрудняе прасоўванне італьянскіх часцей. НА ЗДЫМКУ: транспарт італьянскай лёгкай артылерыі на конях (паўночная Абісінія).

Дэманстрацыя дружбы народаў Совецкага Саюза

Пасяджэнне пленума 10 лютага пачалося з даклада старшыні праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў БССР т. **Клімковіча** аб становішчы літаратуры Совецкай Беларусі.

Пасля тав. Клімковіча слова для даклада аб башкірскай совецкай літаратуры атрымлівае старшыня праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў Башкірыі тав. **Афзал Тагіраў.** Толькі вялікая социялістычная рэволюцыя вызваліла башкірскі народ ад жабрацтва і вымірання. Совецкая мастацкая літаратура Башкірыі ўзнікае толькі пасля Вялікай пролетарскай рэволюцыі, як башкірскі атрад літаратуры Совецкага Саюза.

— Да рэволюцыі, — гаворыць тав. Тагіраў, — Башкірыя не мела сваёй мастацкай літаратуры і літаратурнай мовы. У барацьбе супроць контрэволюцыйных панцюркістаў Хабібулы Габітава, Сагіта, Мірасава і іншых нацыяналістаў, выраслі кадры башкірскай літаратуры. Расце літаратурны маладняк. У Башкірыі арганізаваны і працуюць 72 літаратурныя гурткі.

Пісьменнікамі Башкірыі перакладзены на башкірскую мову «Мае універсітэты» Горкага, «Дзень другі» Эрэнбурга, «Жыццё кліча» Більдэ-Беланэркоўскага і рад іншых твораў.

Апошнія словы тав. Тагірава — башкірскія пісьменнікі на аснове глыбокага вывучэння твораў Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, на аснове вывучэння нашай вялікай социялістычнай радзімы, вывучэння твораў сваіх старэйшых братоў-рускіх пісьменнікаў справяцца са сваімі задачамі і створаць літаратуру, вартую эпохі Леніна—Сталіна — патэнцыял у бурных апладысментах усяго пленума ў гонар правадыра народаў таварыша **Сталіна.**

Спрэчкі, якія разгарнуліся па дакладах тт. Клімковіча і Тагірава, нельга назваць звычайнымі спрэчкамі. Гэта была дэманстрацыя дружбы народаў Совецкага Саюза. Гэта была дэманстрацыя вялікай брацкай дапамогі вядучай рускай літаратуры літаратурам нацыянальных рэспублік.

На пленуме не гаварылася аб беларускай і башкірскай літаратурах наогул, а, як сказаў выступіўшы першым у спрэчках тав. **Леўман,** «аб канкрэтных пісьменніках і аб асобных творах», якім давалася дэтальная дзелавая крытыка.

Тав. Леўман у сваім выступленні зрабіў падрабязны агляд творчасці Кузьмы Чорнага, асобна яго твора «Трэцяе пакаленне». Гэтым творам Кузьма Чорны зрабіў вялікі крок наперад ад правінцыялізма і бытавізма і падняў рад буйных праблем, у прыватнасці праблемы аб новым чалавеку.

Даволі падрабязна прамоўца асвятліў творчасць Міхаса Лынькова. Лынькоў адзін з нямногіх навелістаў, які пачаў сваю творчасць з навелы і да гэтага часу над ёю працуе. У Лынькова ёсць тое, чаго не хапае многім беларускім пісьменнікам. Гэта — здаровы гумар, які ў яго ўдала ўжываецца з сур'ёзнымі, даволі драматычнымі тэмамі.

Малады даравіты Эдуард Самуйлёнак нядрэнна справіўся з задачай стварэння авантурнага рамана—«Таўрыя Каленбрун». Ён здолеў перамагчы пяту такога роду твораў да залішняй меладраматычнасці, але яму яшчэ не хапае яркасці слоўна-мастацкіх сродкаў.

З вялікай ўвагай пленум выслухаў прамову цёпла спатканага тав. **Шырабона** (Бурат-Манголія). Ён падкрэслівае велізарную брацкую дапамогу рускіх пісьменнікаў маладой бурат-мангольскай літаратуры.

Тав. Шырабон асабліва спыняецца на якасці перакладаў твораў пісьменнікаў народаў СССР. Тут адчуваецца саматужніцтва, адсутнасць дастатковага кіраўніцтва з боку праўлення ССП СССР.

Авацыяй сустрэў пленум паэта Казахстана тав. **Джан-сугурава,** які ў яркіх вобразах перадаў прывітанне беларускаму народу ад працоўных Казахстана. Паэт прачытаў на казахскай мове верш «Прывітанне беларускаму народу». Рускі тэкст верша прачытаў тав. **А. Безыменскі.**

З падрабязным аналізам становішча башкірскай совецкай літаратуры выступілі рускія пісьменнікі тт. **Нізавой, Вера Інбер** і **Кір'янаў.**

З вялікай глыбокай прадуманай прамовай аб беларускай літаратуры выступіў т. **Бахмецьеў.** Пісьменнік даў падрабязны аналіз творчасці народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа і пісьменніка Змітрака Бядулі. Янка Купала сам б'е і дабівае сваё мінулае, ён цвёрда стаў на пазіцыі пролетарыята, на пазіцыі социялістычнага рэалізма. Тав. Бахмецьеў даў вельмі высокую ацэнку «Дрытве» Якуба Коласа і, выказаў пажаданне, каб аўтар гэты твор ператварыў ў вялікую эпапею барацьбы беларускіх працоўных сялян супроць інтэрвентаў.

Старому пакаленню пісьменнікаў патрэбна ўвага і дапамога. Але часта замест дапамогі, — адзначыў тав. Бахмецьеў, — нашы беларускія крытыкі неправільнымі неўгрунтаванымі абвінавачваннямі перашкаджаюць выдатным паэтам павышаць ідэйны і мастацкі ўзровень сваіх твораў.

Аб беларускай літаратуры гаварыў таксама ў сваёй прамове тав. **Лідзін** (Масква). Тав. Лідзін асобна спыніўся на творчасці Платона Галавача і яго вялікім творы «Праз гады», даўшы высокую ацэнку тав. Галавачу, як аднаму з самых таленавітых беларускіх пісьменнікаў.

Маладой мацнеючай літаратуры Кара-Калпакіі прысвяціў сваю прамову тав. **Панаў.**

Пленум атрымаў прывітальнае пісьмо ад пісьменнікаў Чэха-славакіі. Шумнымі апладысментамі дэлегаты сустракаюць паведамленне аб тым, што ў Чэхаславакіі ствараецца літаратурная арганізацыя «Блок», якая «будзе яднаць пісьменнікаў, якія стаяць на глебе социялістычнага рэалізма».

Пад бурную авацыю пленум аднагалосна прыняў прапанову паслаць у адказ тэлеграму пісьменнікам Чэхаславакіі і прывітальныя тэлеграмы партыйным і совецкім арганізацыям Украіны, Беларусі і Башкірыі.

2-я ГАДАВІНА
ЧЭЛЮСКІНСКАЙ ЭПАПЕІ

13 лютага 1934 года ў Чукоцкім моры, у 130 кіламетрах ад бліжэйшага берагавога пункту—мыса Онман — загінуў параход «Чэлюскін». 104 удзельнікі экспедыцыі ў пургу, у сямібальны вецер высадзіліся на лёд. Грымелі, стагналі ў страшэнным спісканні ільды, барты парахода трашчалі і ламаліся пад націскам многаметровых ільдзін, быццам тонкія сценкі запалкавай скрынкі.

Людзі працавалі моўчкі, без мітусні, тараніваслі. У 30 метрах ад пагібаючага карабля на шэрай ільдзіне, ухутанай пушыстай росыпью снягоў, быстра расла пёмная груда цюкаў з адзеннем і абуткам, скрынь і бочак з прадуктамі, палатак. З парахода знеслі на руках разводачны самалёт-амфібію. Людзі сцягнулі белыя шлюпкі, аварыйную радыёстанцыю, маленькія чыгунныя печкі. Параход нагружаўся роўна дзве гадзіны. За гэты час з яго было выгружана снаражэнне, неабходнае калектыву для доўгага жыцця на ільдзіне.

Роўна ў 3 гадзіны 20 мінут з борта судна раздаўся загад начальніка экспедыцыі прафесара О. Ю. Шмідта:

— Усе на лёд!

І апошнія на барту расціснутага карабля — 12 партыйцаў і комсамольцаў — быстра, адзін за адным прыгнулі на лёд. Пакінуць карабль не паспеў толькі адзін: загадчык гаспадаркі экспедыцыі—комсамолец Барыс Магілевіч. Ён да апошняй мінуты заставаўся на адказным пасту, ён загінуў разам з караблём, — загінуў, як герой, як большэвік...

Раніцой на наступны дзень свет упершыню пачуў спакойны голас лагера Шмідта. Начальнік экспедыцыі коратка, як у данясенні з ваеннага фронта, паведамляў аб рабоце чэлюскінцаў па абсталяванню лагера, аб падрыхтоўцы аэрадрома.

— У лагеры ўсё спакойна, — радыраваў О. Ю. Шмідт. Гэта кароткая фраза прашла скрозь усё двухмесячнае жыццё большэвіцкага лагера. Лютавалі пургі, лёд над баракам і палаткамі часта аскальваўся шэра-зялёнымі шчылінамі, аэрадромы, з найвялікшым трудом расчышчаныя сярод востразубых таросаў, за некалькі гадзін ператвараліся ў дзівосныя нагромаджэнні векавечных ільдоў. Але кароткія, сухія як стрэл, зводкі, зноў і зноў даносілі на матэрык:

— У лагеры ўсё спакойна.

Чэлюскінцы жылі напружана, гатовыя кожную мінуту сустрэць напор стыхіі і не шкадуючы сіл адбіць яго. Дружным, непахісным калектывам трымаліся яны сярод ільдоў, сярод шчылін і спісканняў, сотнямі кіламетраў бездарожжа адрэзаныя ад усяго свету.

***

Радасным упоўнаканнем сустрэла вестку аб пагібелі «Чэлюскіна» жоўтая прэса капіталістычных краін. Белагвардзейскія газеты, прадажныя лісткі амерыканскага «газетнага бандыта» Хэрста наперабой крычалі аб паражэнні, аб бяссіллі большэвікоў. Яны лікавалі, вітаючы мнімае паражэнне. У голас жоўтай прэсе, але скромна і стрымана ўтарылі ўсе буржуазныя газеты. Яны малявалі жудасці голаду ў лагеры, пагібель людзей. Яны не толькі сумняваліся ў магчымасці выратавання чэлюскінцаў, але адкрыта гаварылі, што ўвесь калектыў асуджан на пагібель.

Нават вучоныя буржуазныя даследчыкі Арктыкі выказвалі сумненне ва ўдачы выратавальных аперацый.

Ішлі дні. І паступова прыкрытая спачуваннем радасць ворагаў уступіла месца паведамленням аб гераічнай рабоце выратавальных аперацый. А праз два месяцы — 13 красавіка — увесь свет даведаўся, што на самалёце совецкага лётчыка Молакава з лагера Шмідта вылецеў апошні чэлюскінец — начальнік аэрадрома Александр Пагосаў.

Вестка гэта узарвалася, як бомба, за рубяжамі нашай краіны. У яе не хацелі верыць. Але трыумфальнае шэствіе пераможнага Арктыкі — чэлюскінцаў і іх выратавальнікаў праз усю краіну было фактам, аспрэчваць які не мог ніхто.

У лагеры і пазней — у час выратавальных аперацый — ніхто не загінуў. Ніхто нават не захварэў. Людзі вярнуліся на радзіму поўныя бадзёрасці, сілы, энергіі, прагныя да новай барацьбы і новых перамог. Гэта здавалася амаль звычайным людзям нашай краіны. Але для людзей, здалёку назіраўшых за намі, гэта здавалася сапраўдным цудам.

...«Святая Анна» і «Жанэтта», дырыжабль «Італія» і паветраны шар «Орел», самалёт «Латам» і дзесяткі іншых самалётаў, невялікіх экспедыцыйных суднаў і вялікіх караблёў, рабіўшых арктычныя рэйсы пад сцягамі ўсіх нацый, гінулі ў ільдах. Сотні вучоных, спартсменаў і проста авантурыстаў, шукаўшых у арктычных рэйсах нажыву і славу, знайшлі сваю магілу на чорных скалах палярных астравоў, на блакітных прасторах многагадовых арктычных ільдоў. Іх прабавалі выратоўваць, і часцей усяго гэтыя выратавальныя экспедыцыі таксама гінулі.

А чэлюскінцы выратаваны. Чаму?

...Паўночныя акраіны Еўропы і Азіі дзесяткі гадоў былі ва ўладзе самадзяржаўнай Расіі. Наглая і драпежніцкая эксплаатацыя паўночных народнасцей, гарэлка і танныя нягодныя тавары — вось уся «культура», якой снабжалі поўнач рускія купцы. Яны шукалі нажывы. І разам з імі, за «доўгім рублём», нажывай і славай, на поўнач ішлі экспедыцыі англічан, італьянцаў, галандцаў і многіх іншых. Радзей на поўнач ішлі навуковыя экспедыцыі. Вільям Баранц, Амундсен, Нансен, Нордэншэльд і інш. на свой страх і рызыку, на свае сродкі знаражалі дранненькія караблі і адпраўляліся на поўнач. Іх імёны , — гэтых чэсных самаадданых вучоных — герояў поўначы, — будуць вякамі захоўвацца ў гісторыі Арктыкі. Нават на мізэрныя сродкі філантропаў мецэнатаў гэтыя людзі, узброеныя самай адсталай тэхнікай, рабілі цуды. Ні адна краіна не давала ім грошай для знараджэння экспедыцый. Ясна таму, што тэхнічна слабыя, амаль бяссільныя караблі запіраліся ільдамі і загіналі ў адзіноцтве, загадзя асуджаныя на гэту пагібель яшчэ пры выхадзе ў мора. Так з Арктыкі не вярнуўся рускі вучоны Георгій Седоў, нарвежец Амундсен, Брусілаў і многа, многа іншых. Часта іх нават не выратоўвалі: рускія ўлады забаранілі Седову паставіць на сваім караблі маленькую радыёстанцыю, не гаворачы ўжо аб знараджэнні выратавальнай экспедыцыі.

...Совецкі параход «Чэлюскін» ішоў у Арктыку, атрымаўшы цвёрдае заданне партыі і ўрада: — у адну навігацыю прайсці паўночны морскі шлях. Гэта заданне было выканана: «Чэлюскін» загінуў, амаль завяршыўшы арктычны пераход. Навейшай тэхнікай быў узброен наш карабль. Краіна дала экспедыцыі ўсё самае каштоўнае, самае лепшае, што ў яе было. Усё самае лепшае мелі чэлюскінцы на ільду.

Партыя і ўрад совецкай краіны ніколі не пакідаюць сваіх грамадзян у бядзе. Чэлюскінцы ведалі гэта, і таму так спакойна жылі два месяцы ў лагеры. Партыя і ўрад кінулі на іх выратаванне дзесяткі лепшых совецкіх самалётаў, лепшыя совецкія караблі, лепшых сыноў нашай радзімы. І ўсе да аднаго былі выратаваны: не толькі людзі, а нават навуковыя прыборы, запасы, футравая бялізна і асабістыя дзённікі разам з чэлюскінцамі былі дастаўлены на матэрык.

У гэтым — у процілегласці двух сістэм — капіталістычнай і сацыялістычнай — розніца паміж пагібеллю «Чэлюскіна» і палярнымі трагедыямі караблёў, рабіўшых арктычныя рэйсы пад сцягамі чужых нацый.

***

Уся краіна сачыла за жыццём лагера, за работай герояў-лётчыкаў. Напружана і чула кіравала выратавальнымі аперацыямі партыя на чале з любімым, дарагім таварышам Сталіным.

Сёння наша краіна адзначае мужнасць, адвагу, гераіства чэлюскінцаў, мужнасць людзей, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна. А праз два месяцы — 13 красавіка 1936 года—наша краіна, а разам з ёю ўсё лепшае, чэснае і перадавое ў капіталістычных краінах, адзначыць другую гадавіну найвялікшай перамогі большэвікоў — выратавання чэлюскінцаў з дрэйфуючай ільдзіны Чукоцкага мора.

Ал. МІРОНАЎ.
Чэлюскінец-ордэнаносец.

Метад даяркі БАШКІРАВАЙ

12 год працуе даяркай Ефрасіня Сільвестраўна **Башкірава** ў племгасе «Крынкі». Малочна-таварная ферма племгаса—адна з лепшых у Лёзнянштыне. Башкірава даглядае 12 кароў. За час сваёй работы яна вывучыла кожную карову, яе капрызы і да кожнай падыходзіць асобна. У яе групе ёсць карова-рэкардыстка **«Формула»**, сутачны ўдой якой 32 літры. За гэты год Башкірава надаіла ад 12 кароў 33 тысячы 441 літр малака замест 29 тысяч 353 літраў, а ад рэкардыстки «Формула» надаіла за год 5.700 літраў. Сваіх кароў Башкірава за адзін толькі год раздваіла на 135 проц.

Удой каровы, — кажа Ефрасіня Сільвестраўна, — залежыць ад даяркі. Я за 12 год сваёй работы ў гэтым пераканалася.

Работу на ферме пачынаюць у 3½ гадзіны раніцы. Раней чым прыступаць к даенню, даяркі пяць мінут займаюцца фізічнай зарадкай. Гэта робіцца для таго, каб размяць пальцы.

Пасля фізічнай зарадкі кожная даярка робіць ванну для рук. На працягу 15 мінут яны трымаюць рукі да локця ў цёплай вадзе. Гэта робіцца для таго, каб рукі ад даення не так хутка стамліліся. Пасля ванны кожнай карове летняй вадой падмываецца вымя і насуха выціраецца.

Першыя струменькі малака Башкірава здойвае ў асобную пасудзіну. Гэта робіцца таму, што саскі могуць быць нячыстымі і малако загразніцца, а к гэтаму яшчэ і малако ад першых струмянькоў не тлустае.

— Калі я саджуся даіць, — кажа тав. Башкірава, — то стараюся чым найхутчэй раздаіць. У часе даення, каб не заставалася малака, я раблю масаж вымя. На даенне кожнай каровы ў мяне ідзе 5—6 мінут.

Пасля даення пачынаецца кармленне і чыстка кароў. А чысцяць іх тут кожны дзень содай з мылам. Гэтым растворам мыецца ўся карова. Каб каровы ад мыцця не застужваліся, у кароўніку цепляння даходзіць зімою да 10—12 градусаў.

У 8 гадзін раніцы пачынаюць даіць кароў цёплай вадой. У 9 гадзін раніцы зноў даюць. У 12 гадзін чыстка кармушак, даенне і мыццё кароў. На працягу дня Башкірава доіць кароў 4 разы і кожны раз робіць для сябе фізічную зарадку і ванну.

Кормяцца і пояцца каровы 4—5 раз у дзень.

— Я, — кажа Башкірава,—спаборнічаю з даяркай нашага племгаса Мятловай. Яна раней адставала ад мяне, а зараз пашла наперад. Падцягнулася і даярка Людзінская.

Мая рэкардыстка «Формула» за дзень атрымлівае 35 кіло кораньплодаў, 8 кіло канцэнтратаў.

На ферме ёсць радзільнае аддзяленне. Цялё бачыць сваю матку тады, як народзіцца, больш яго пад карову не падпускаюць. У першай палове цельнасці Башкірава сваіх кароў корміць 4 разы ў дзень, у другой палове—да 5 раз, і пераважна сухім кормам. Кораньплодаў карова ўжо не атрымлівае, змяншаецца норма і канцэнтратаў. Пасля таго, як карова запусціцца, яе кормяць больш разоў, але па меншай норме. У дзень карова атрымлівае 2 кіло канцэнтратаў і 5—6 разоў поіцца.

— Калі даваць цельнай карове поўную норму кармоў, ды яшчэ часта, то цялё затхнецца. За 12 год работы на ферме ў мяне не было выпадку, каб мае каровы абартавалі.

Мая рэкардыстка «Формула» прывыкла да адной вады. Калі ёй даеш піць ваду не з крана, а з бочкі, то яна ад такой вады адмаўляецца.

Свой метад работы Башкірава перадае ўсім даяркам. Зараз племгас «Крынкі» мае такіх стахановак жывёлагадоўлі, як Башкірава, Мятлова, Людзінская і іншыя.

Для павышэння сваёй кваліфікацыі даяркі наведваюць зоатэхнічны гурток. За аўладанне тэхнікай жывёлагадоўлі тав. Башкірава атрымала значок «ЗОТ». Зараз яна змагаецца за тое, каб надаіць ад кожнай каровы да 5 тысяч літраў малака ў год.

Д. МАЛЕВІЧ.
Племгас «Крынкі», Лёзнянскі раён.



РЫХТУЮЦЦА КАДРЫ. НА ЗДЫМКУ: лепшыя ўдарнікі вучобы, трактарысты Грэскай МТС (з лева направа): тт. С. Высоцкі, А. Фалько, Т. Івашко, Ф. Адамовіч, Ц. Бабко, А. Кур'яновіч пад кіраўніцтвам механіка сельскагаспадарчых машын т. Барысевіча вывучаюць нова-прыбыўшую ў раён жатку-снопавязалку.

Фото ШАРШНЕВА.

КАМБІНАТ ТЭХВУЧОБЫ

БАБРУЙСК. **(Кар. «Звязды»).** На Бабруйскім лесакамбінаце існуюць 4 ступені тэхвучобы.

Першая ступень—для новапаступіўшых на камбінат рабочых. іх знаёмяць з асноўнымі абавязкамі. Праграма разлічана на 15 гадзін.

Другая ступень — гурток па тэхмінімуму, дзе рабочы вывучае свой варштат, свае абавязкі і некаторыя агульныя дысцыпліны Праграма разлічана на 70 гадзін.

Трэцяя ступень — гурток па павышэнню кваліфікацыі, або, як яго завуць на камбінаце — гурток «выдатнікаў». У гэтым гуртку вывучаецца ўвесь тэхналагічны працэс. Праграма разлічана на 150 гадзін.

Чацвертая ступень — гэта сярэдняя тэхнічная школа. Яна пачала работу з 9 лютага гэтага года.

У тэхгуртках і школе рабочага навучаюць не толькі тэхніцы яго справы, але і агульным і палітычным ведам, што стварае ўмовы для агульнакультурнага і палітычнага росту рабочага.

Зараз у першай ступені навучаецца 287 чалавек, другой ступені — 737 чалавек, трэцяй ступені —845 чалавек і ў сярэдняй тэхнічнай школе—180 чалавек. Разам — 2052 чалавекі, што складае каля 80 проц. усіх рабочых, занятых на вытворчасці.

Апрача таго створана група лепшых стахановцаў (20 чалавек), якая займаецца са спецыяльна прымацаванымі інжынерамі. У гэту групу ўваходзяць вядомыя стахановцы тт. **Рушко, Гладышоў, Іваноў, Анціпаў** і іншыя.

Для дапамогі ў правядзенні тэхвучобы пры камбінаце створан тэхнічны кабінет. **П. ЧЫКУН.**

Небывалы рост прадукцыйнасці працы

ДЗЯРЖЫНСК. У калгасах раёна праходзяць стаханаўскія дні, пяцідзённі і дэкады. Стаханаўскі дзень на вывазцы торфу правёў калгас **«Комінтэрн»**, Рубілкаўскага сельсавета. За гэты дзень вывезена 400 тон торфу. Кожны калгаснік замест 8 вазоў вывез па 18—20 вазоў.

У калгасе **«Комунар»** у стаханаўскі дзень вывезена 750 тон торфу. Кожны калгаснік вывез па 47 вазоў.

У калгасе імя СНК БССР, Озерскага сельсавета, была арганізавана стаханаўская пяцідзённа. Першыя дні далі станоўчыя рэзультаты. На 24 студзеня ў калгасе было вывезена на поле 4.650 тон торфу. План вывазкі торфу перавыканан ужо больш чым удвая. Калі звычайна ў дзень вывозілася па 60—70 тон, то ў стаханаўскія дні — 250—300 тон торфу. Наперадзе брыгада № 2, брыгадзірам якой з'яўляецца ўдзельнік усебеларускай нарады па ўраджайнасці Васіль Паляшук.

Лепшая калгасніца-ўдарніца **Рыпіна Галякевіч** накідвае ў дзень па 79 вазоў торфу, замест 7—8 вазоў да стаханаўскіх дзён. Рыпіна Галякевіч паставіла перад сабой задачу—павысіць выпрацоўку да 100 вазоў у дзень. У брыгадзе № 3 калгасніцы-ўдарніцы Маня Лобач, Мальвіна Юрэвіч, Маня Лічко і Вера Калечыц накідваюць у дзень па 60 вазоў торфу.

РАТКЕВІЧ.

Леспрамгасы зрываюць работу буйнейшага лесазавода

ВІЦЕБСК. **(Кар. «Звязды»).** Лесазавод імя «Правды» з-за адсутнасці сыравіны не можа ўключыцца ў стаханаўскую дэкаду.

Для таго, каб забяспечыць сутачнае выкананне плана, заводу неабходна мець 38 вагонаў драўніны. Белдрэў забяспечвае завод толькі 12—15 вагонамі.

Завод працуе толькі 2 змены і то з вялікімі перабоямі.

Сіроцінскі леспрамгас да 15 лютага павінен адгрузіць 75 платформ сыравіны; на 10 лютага адгружана толькі 20 платформ, а аршанскі замест 90 платформ адгрузіў 10, полацкі замест 160, — 50, віцебскі замест 34, — 2. Лепельскі леспрамгас не адгрузіў ні адной платформы спецсыравіны, якой ён павінен даць 15 платформ.

Па заяве тэхнічнага дырэктара завода **Лебедзева** наяўнасць сыравіны на 11 лютага забяспечвае работу толькі на адну змену. Завод знаходзіцца пад яўнай пагрозай спынення работы.

Белдрэў не забяспечвае таксама завод рамамі і пілямі тонкага размеру (13, 14, 15), з-за чаго зрываецца выкананне ўрадавага заказу для завода Гомсельмаш.

ЗАРУБЕЖНЫ.

ДРУЖБА НАРОДАЎ

Ром. ЛЯПІЧ

Наша беларуская совецкая літаратура моцна спаяна брацкімі вузамі дружбы і творчага супрацоўніцтва з літаратурай іншых совецкіх рэспублік, з усесаюзнай вялікай літаратурай вялікай эпохі І. В. Сталіна, эпохі пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства. А «дружба паміж народамі СССР — вялікае і сур'ёзнае заваяванне. Бо пакуль гэта дружба існуе, народы нашай краіны будуць свабодны і непераможны». (І. В. **Сталін**).

Мінулы 1935 творчы год азнаменаван для нашай беларускай совецкай літаратуры выхадам у свет раду кніг і зборнікаў у перакладзе на рускую мову, што дае магчымасць азнаямлення з ідэйна-мастацкімі дасягненнямі і ростам беларускай совецкай літаратуры шматмільённаму рускаму чытачу. Так, напрыклад, перакладзены і выданы ў Маскве раман П. Галавача «Праз гады», аповесць З. Бядулі «Набліжэнне», зборнікі выбраных вершаў і паэм Янкі Купалы, Якуба Коласа, Ізі Харыка, П. Броўкі і інш. Гэты факт — канкрэтны доказ ідэйнай і фармальна-мастацкай спеласці, росту, доказ таго, што яна выходзіць у авангардныя калоны, па праву займае пачэснае месца ва ўсесаюзнай совецкай літаратуры.

Разам з гэтым, з другога боку, беларускія совецкія пісьменнікі і паэты за 1935 год пераклалі на беларускую мову, а Белдзяржвыдавецтвам выданы рад кніг і зборнікаў рускіх пісьменнікаў і паэтаў, а таксама пісьменнікаў іншых брацкіх нацыянальных рэспублік.

Да ўсесаюзнага пленума ССП выдана таксама вялікая «Анталогія рускай совецкай паэзіі» *). У «Анталогіі» змешчаны вершы і паэмы: В. Брусава, А. Блока, В. Маякоўскага, Д. Беднага, Н. Асеева, Н. Тіханава, Б. Пастэрнака, С. Есеніна, В. Каменскага, І. Сельвінскага, В. Кірылава, В. Казіна, А. Безыменскага, Э. Багрыцкага, М. Светлова, І. Садоф'ева, В. Інбер, В. Лугаўскога, М. Галоднага, П. Антакольскага, С. Кірсанава, А. Пракофьева, А. Суркова, М. Ісакоўскага, Б. Карнілава, І. Уткіна, Н. Дземянцева, В. Гусева, А. Жарава, Н. Ушакова, П. Беспашчаднага.

«Анталогія» складзена ў пераважнай сваёй большасці з лірычных вершаў, а таксама заключае ў сабе і некалькі эпічных твораў — паэм названых паэтаў.

Надзвычай цяжка і амаль немагчыма ў сціслых ламерах невялічкага газетнага артыкула не толькі даць усебаковую і глыбокую ацэнку, але і нават зрабіць пералік тэм, той праблематыкі, што ўзняты ў «Анталогіі», а таму мы абмяжуем сваю ролю беглым аглядам змешчанага ў ёй матэрыялу.

Сярод ліра-эпічных твораў тут змешчаны: паэма Ал. Блока «Дванаццаць» (пераклад Ал. Дудара), урыўкі з паэм В. Маякоўскага «Владзімір Ільіч Ленін» (пераклад П. Броўкі) і «На ўвесь голас» (пераклад Т. Кляшторнага), паэма Д. Беднага «Галоўная вуліца» (пераклад С. Дарожнага), паэма А. Безыменскага «Трагедыйная ноч» (пераклад М. Ціхановіча) і Э. Багрыцкага «Дума пра Апанаса» (пераклад М. Хведаровіча). Трэба шчыра прызнаць, што пераклады зроблены добрасумленна, на досыць высокім мастацкім узроўні; гучанне паэтычнага радка ў гэтых творах не згубіла сваёй асаблівасці, зыходзячай з творчых асаблівасцей іх аўтароў, з асаблівасцей іх паэтычнага голасу, такту, манеры пісьма, у іх захаваны тыя тонкія лірычныя нюансы, тыя характэрны ім у арыгінале. Вось некалькі прыкладаў:

«Як узяліся нашы хлопцы
У чырван-гвардыі служыць,
У чырван-гвардыі служыць—
Буйну голаву зламыць.
Эх ты, гора-горкае,
Салодкае жыццё.
Стрэльба аўстрыяцкая,
Падраны палітон». («Дванаццаць» А. Блока).

Тут захаваны і песенна-фальклорны каларыт верша і асаблівасці байцоў Чырвонай гвардыі, з своеасаблівым лексічным складам іх мовы і рэвалюцыйная, аптымістычная патэтыка, захаваны ўсе асаблівасці блокаўскага верша, страпы захаваны.

Або, напрыклад, у таленавіта перакладзенай П. Броўкам паэме Вл. Маякоўскага «В. І. Ленін»:

«Біўся
аб Леніна
цёмны клас,
цек
ад яго
ў прасвятленні,
і абладзены сілай
і думкамі мас,
з класам
рос Ленін»...

Пераданы ўсе асаблівасці мужнага, трыбуннага паэтычнага голасу Маякоўскага. Такім-жа ён паўстае перад намі і ў перакладзенай т. Кляшторным паэме «На ўвесь голас»:

«І ўсё,
што несла ў свет
мая рука,
што дванаццаць год
у бойках пралятала,
да самага апошняга радка
я
аддаю табе,
планеты пролетарый»...
«Мой верш
прарве
грамады год
і пойдзе
у вякі
і важна
і нястрымна,
нібы да нашых дзён
дайшоў вадаправод,
збудаваны яшчэ
рабамі Рыма»...

або:

«...няхай
нам помнікам
агульным будзе
збудованы ў баях соцыялізм...»
«Прышоўшы ў Цэ Ка Ка
шчаслівых
зім і лет,
над бандай
паэтычнаю
рвачоў
і «выжыг»
я узніму,
як большэвікі партбілет,
ўсе сто тамоў
маіх
партыйных
кніжак».

Гэта-ж можна сказаць і аб перакладзе «Думы пра Апанаса» Эд. Багрыцкага, «Галоўнай вуліцы» Д. Беднага, «Трагедыйнай ночы» А. Безыменскага. Набыўшы новую нацыянальную форму, гэтыя творы не згубілі ні ў якой меры свайго баявога, палітычнага значэння, сваёй велізарнай функцыянальнай сілы ўздзеяння на свядомасць беларускага працоўнага чытача, сваёй рэвалюцыйнай мэтанакіраванасці, аптымістычнага ўцвярджэння класавай праўды пролетарыята і яго партыі, сваёй інтэрнацыянальнасці і інш. Гэты факт б'е не ў брыво, а прама ў вока, як па вялікадзяржаўніках з іх «тэорыяй» самабытнасці і культурнай адсталасці беларускай мовы, аб немагчымасці быццам-бы ёю перадаць у высокамастацкай слоўнай апрацоўцы вялікіх ідэй і праблем, і з другога боку — па беларускіх буржуазных нацыяналістах з іх нацыяналістычна-заалагічнымі «тэорыямі» нацыяналістычнай абмежаванасці, замкнутасці, адчужанасці ад культуры іншых совецкіх народаў.

У надзвычай велізарнай колькасці вершаваных твораў выдзяляецца некалькі асноўных, вядучых, тэм, якія чырвонай ніткай пранізваюць усю «Анталогію». Перш за ўсё — ленінская тэматыка, ленінскі эпас: ідэя неўміручасці, вечнасці ленінскага вобразу, які жыве ў сэрцах працоўных розных нацый і колераў. Вобраз Ільіча выступае ў іх у двух аспектах: як жывы, рэальна дзеючы вобраз правадыра і як ідэя, як сцяг барацьбы з соцыяльнымі прыгнятальнікамі. Тут неабходна ўказаць нам на вядомы верш А. Безыменскага «Партбілет № 224332», верш Н. Тіханава «Самі», верш В. Брусава «Ленін», верш А. Жарава «Пахаванне Леніна» і інш.

«Не стала аднаго маленькага
білета,
А ў целе партыі нязмераны
правал...».
«Вал пролетарыяў пад сцягам
Комінтэрна
Запоўніць ў партыі нязмераны
правал...»
«...сто тысяч партбілетаў
Заменіць ленінскі загублены білет»

(«Партбілет № 224332» — пераклад Дудара).

Тут фізічная смерць В. І. Леніна ўспрымаецца паэтам у плане сцвярджэння неўміручасці ленінскіх ідэй і спраў, суровая рытмічнасць верша перадае ўсю жалобную ўрачыстасць часоў апошніх развітанняў прапоўных са сваім настаўнікам і правадыром.

У вершы «Сам» Н. Тіханава (пераклад Дудара) вобраз Леніна перадаецца як сімвал працоўнага чалавецтва, як сцяг барацьбы, прычым гэта падаецца паэтам праз перажыванні індыйскага працоўнага Самі.

Героіцы грамадзянскай вайны, узброенай барацьбе прапоўных са знешнімі і ўнутранымі ворагамі дыктатуры пролетарыята ў розных аспектах, варунках і сітуацыях прысвечаны цэлы рад вершаў, з якіх неабходна выдзеліць: вершы В. Лугаўскога («Моладзь», славутая яго «Песня аб ветры», «Гаць»), Ул. Кірылава («Матросы»), В. Брусава («Да рускай рэволюцыі»), Н. Асеева («Граніца»), Ал. Суркова («Над картай Саюза»), вершы Б. Карнілава, І. Уткіна, І. Садоф'ева, Н. Дземянцева і інш.

У апошнім вершы, напрыклад, т. Ал. Суркоў выводзіць абаяльную постаць героя грамадзянскай вайны, які на фронце згубіў зрок. Вобраз гэтага захапляючага сабой барацьбіта за Кастрычнік паданы ў адчувальных танах цёплай лірычнасці, у плане рэволюцыйна-аптымістычнага ўцвярджэння нашай яшчэ больш светлай і радаснай рэчаіснасці:

«Каля карты радзімы маёй пастаім,
Будзем памяць, як кнігу, лістаць,
Пра гады, што запісаны ў сэрцы маім,
І праславім у песні іх словам такім,
Што вякі не пакінуць спяваць».
(Пераклад П. Глебкі).

Выдзяляецца верш А. Суркова «Нянавісцю прысягаем» на тэму аб злачынскім забойстве мужнага «гераічнага большэвіка» С. М. Кірава. Верш насычан палкімі пачуццямі класавай нянавісці да ворагаў і любві да працоўных. Ад халоднай настарожанасці і пільнасці, ад балючага перажывання забойства правадыра —

«Стрэлам кінуты выклік варожы
Сударгай болі пальцы сціснуў»,—

паэт тут-жа задушэўна, цёпла, лірычна ўсхвалявана:

«Друг мой,
Таварыш ты мой харошы,
Цяжка. Чае зацюдзеш слоў...»

Мабілізацыі класавай пільнасці да «роўнадушных», пад маскай якіх «сядзіць правакатар», тактыка якіх гэта «тактыка хамелеона, за якімі «глядзець трэба пільна», прысвечаны сапраўды страсныя, усхваляваны ад шчырасці, верш М. Галоднага «Слова прыстрасных». Майстэрскі перакладзены т. А. Александровічам, верш гэты прасякнуты страснай большэвіцкай партыйнасцю.

Совецкія паэты не рафінаваныя эстэты, шукальнікі надземнага хараства, а сыны працоўнага народу. Гэта надзвычай удала выразіў В. Казін у вершы «Эпоха»: «Бачу я ў ямбе і ў харэі бацькаву мазольную руку».

Неабходна адзначыць яшчэ такія творы, як «Муляр» В. Брусава (пераклад Ал. Дудара) і «Русь Совецкая» С. Есеніна (пераклад А. Дудара).

«Русь Совецкая» С. Есеніна — твор, напоўнены раздзіраючымі супярэчнасцямі ідэалагічных пазіцый паэта часоў канца аднаўленчага перыяду, дзе, з аднаго боку, паэт прызнаецца і балючым адчуваннем з поўным сумам у душы, што

«І мова землякоў нібы чужая
мне,
Як чужаземец стаў я ў родным
краі»...

што

«Больш не патрэбна тут паэзія
тая,
Ды, мусіць, я і сам тут болей
не патрэбен»...

і з другога:

«Аддам душу Кастрычніку і
Маю»...
«Я буду пець
Усёй істотаю ў паэце
Часць шостую зямлі,
З кароткай назвай «Русь».

Вясковая, калгасная тэматыка мала адлюстравана ў вершах, змешчаных у «Анталогіі». З нязначнай групы вершаў з вяскова-калгаснай тэматыкай неабходна выдзеліць «Паэму адыходу» М. Ісакоўскага, яго-ж верш «Арэхавыя палкі», у якім гэтыя «Арэхавыя палкі», што высякаюцца на папы, служаць сімвалам гаспадарчага прымітывізма аднаасобнай гаспадаркі, у ім дана антытэза старой і новай вёскі, антытэза гэтага прадзедаўскага гаспадарчага прымітывізма і індустрыяльных працэсаў працы ў калгасах. «Паэма адыходу»—гэта сапраўдны паказ працэсу адыходу лепшых, перадавых людзей вёскі ў першыя гады калектывізацыі ад яе сівой старыны і забабоннасці, з яе дзікімі патрыярхальнымі звычаямі, у новае, радаснае і заможнае жыццё. Старая дарэволюцыйная вёска падана ў змрочных, гнятучых сваёй праўдзівасцю, танах: «На дванаццаць замкоў хутарская замкнута Расія», «Гэта край, дзе прасторнаму слову з'яўляцца не велена», і т. д.

«Анталогія» ў цэлым прасякнута здаровым і бадзёрым рэвалюцыйна-зацвярджаючым аптымізмам, што ўспрынята совецкімі паэтамі ад гераічнай рэчаіснасці соцыялізма, рэалістычнасцю, рэволюцыйнай мэтанакіраванасцю, характарызуецца высокай перадавой ідэйнасцю і не менш высокай мастацкасцю.

Нашы-ж беларускія совецкія паэты, выдаўшы такую «Анталогію рускай совецкай паэзіі», даказалі свой рост, спеласць, сваю інтэрнацыянальнасць.

Як на недахопы, неабходна паказаць на поўную адсутнасць датыроўкі, неаднолькавую якасць паперы і на досыць бледнае і прымітыўнае як па ідэі, так і майстэрству афармленне кнігі (невядомага, на жаль, мастака).

Трэба прызнаць, што і ў некаторых перакладах вершаў ёсць недакладнасці і шарахаватасці (тт. М. Хведаровіча, С. Дарожнага, М. Ціхановіча і інш.). Вось прыклад: «Сустрэўся Іосіф Коган з Несцерам Махною (?), а не Махно; «вечарэе, у хаце Коган малачко **хлябае**» і т. д. (пераклад М. Хведаровіча). А вось і адваротны прыклад, іменна майстэрскага перакладу:

«За Менскам стыне шыр-прастор.
А воку пільнаму не спіцца.
Там, дзе шуміць сасновы бор,
Там наша моц, там—наш дазор—
Чырвонаармейская граніца». («Граніца» Н. Асеева, пераклад Александровіча).

Нарэшце, у плане пажадання нашым беларускім совецкім паэтам — у 1936 годзе выдаць зборнікі хоць-бы перакладаў з расійскіх класікаў і паэтаў брацкіх нацыянальных рэспублік.

*) «Анталогія рускай совецкай паэзіі» — пад рэдакцыяй Андрэя Александровіча і Пятруся Броўкі. Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі.

СТАХАНАЎЦЫ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ НА ПРЫЁМЕ Ў СОЎНАРКОМЕ БССР

Учора старшыня СНК БССР тав. **Галадзед** і намеснік старшыні СНК БССР тав. **Саакян** у вялікай зале пасяджэнняў СНК прынялі ўдзельнікаў усебеларускага злёта стахановаў грамадскага харчавання. На прыёме таксама прысутнічалі намеснік Наркамунтгандля тав. Верба і кіраўнік справаў СНК тав. Лук'янчык.

У таварыскай гутарцы, якая пягнулася дзве з паловай гадзіны, стахановцы грамадскага харчавання—повар Шыманскі (Менск), повар Жураўскі (Віцебск), афіцыянтка Сабалеўская (Менск), буфетчыца Салаўёва (Віцебск), падсобная работніца Быліч (Віцебск), повар Пятроўскі (Менск) і іншыя — расказалі кіраўніку ўрада, як яны змагаюцца за культурнае і добраякаснае абслугоўванне спажыўцоў і павышаюць прадукцыйнасць працы.

Сустрэты апладысментамі, выступіў з вялікай прамовай таварыш Галадзед. Ён спыніўся на становішчы і значэнні грамадскага харчавання ў агульным будаўніцтве нашай краіны і паставіў перад стахановцамі рад канкрэтных задач у галіне паляпшэння грамадскага харчавання.

З прамовамі выступалі таксама тт. Саакян і Верба.

ЗАКОНЧЫЛАСЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА СТАХАНАЎЦАЎ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ

Учора ў Менску закончылася ўсебеларуская нарада стахановаў грамадскага харчавання. Удзельнікі нарады звярнуліся з адозвай да ўсіх работнікаў грамадскага харчавання БССР аб перабудове і паляпшэнні работы сталовых і рэстаранаў.

АКАДЭМІЯ НАВУК У ДАПАМОГУ КАЛГАСАМ

Пры Беларускай акадэміі навук створана кансультацыйнае бюро з акадэмікаў і прафесароў па ўнядрэнню навуковых дасягненняў у практыку соцыялістычнага земляробства і аказанню практычнай дапамогі калгасам і соўгасам у павышэнні ўраджайнасці. У бягучым годзе каля Менску закладваецца даследчае поле. Інстытуты агралесабанаўства, біялогіі, торфу і эканомікі прымацоўваюць сваіх работнікаў да паасобных калгасаў. Вызначан спецыяльны фонд для прэміравання тых навуковых работнікаў, якія дабіваюцца разам з калгаснікамі найвышэйшай ураджайнасці ў 1936 г. Да весняной сяўбы падрыхтоўваецца рад навукова-папулярных брашур па пытаннях развіцця стахановскага руху ў соцыялістычным земляробстве, ужывання ўгнаенняў, адабычы і ўжыванню ў сельскай гаспадарцы торфу і т. д. Створана брыгада ў складзе акадэміка Афанасьева, праф. Дарожкіна, праф. Бахцеева і інш. для вывучэння вопыту перадавых калгасаў і соўгасаў БССР, каб пашырыць яго сярод усіх калгасаў і соўгасаў рэспублікі.

АБЯЗБОЛЬВАННЕ РОДАЎ У ВІЦЕБСКУ

ВІЦЕБСК, 10 лютага. (БЕЛТА). У віцебскай больніцы імя Калініна пад кіраўніцтвам праф. Кроля праведзен вопыт абязбольвання родаў. Калгасніца Чарнавусава нарадзіла дзяўчынку вагою 4 кг. 100 гр., нармальна і без болю. Дзве мясцовыя работніцы таксама нарадзілі нармальна і без малейшага болю. Рожаніцы выказалі гарачую падзяку ўрачам.

КУРСЫ ДЛЯ СТАХАНАВАК ІЛЬНУ І ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

ДУБРОЎНА, 11 лютага. (Кар. «Звязды»). У раёне праведзены месячныя курсы для стахановак ільну і жывёлагадоўлі. 25 лепшых трапальшчыц, даярак і свінарак вывучылі агратэхніку ільну і зоатэхніку. Апрача гэтага, яны прайшлі курс бягучай палітыкі і агульнаадукацыйных прадметаў. Большасць курсантак вытрымалі іспыты па пройдзенай праграме на «вельмі добра» і «добра».

ФІЛІЯЛ МЕНСКАГА АЭРАКЛУБА Ў БАРЫСАВЕ

БАРЫСАЎ, 11 лютага. (Кар. «Звязды»). Пачата работа па арганізацыі ў Барысаве філіяла менскага аэраклуба. Запалкавая фабрыка імя Кірава першай уступіла ў юрыдычныя члены аэраклуба і адпусціла 40 тыс. рублёў для набыцця матэрыяльнай часткі.

ПРАЦАДЗЕНЬ У КАЛГАСЕ «ПРАЎДА»

Калгаснікі калгаса «Праўда», Коханаўскага сельсовета (Талачынскі раён), атрымліваюць на працадзень па 1 кілограму збожжавых культур, па 1 р. 75 к. грашыма і т. д. Калгаснік Кролік з сям'ёй выпрацаваў 1061 працадзень, на якія атрымаў 1835 руб. грашыма, 3183 кілограмы збожжа, 12,7 тоны бульбы, 683 кілограмы яблык, 290 кілограм гародніны і 4186 кілограм сена і саломы. **О. ЗУСІН.**

МЭБЛЯ ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ

БАБРУЙСК, 11 лютага. (Кар. «Звязды»). Мэблевая фабрыка імя Халтурына ў 1936 годзе выпусціць рознай мэблі на суму 2.800 тыс. руб. За 1935 год прадукцыя фабрыкі склала 1.540 тыс. руб.

Фабрыка асвоіла выпуск высокаякасных буфетаў і крэслаў, а таксама канцылярскіх сталоў. У другім квартале фабрыка пачне выпуск люстравых шафаў высокай якасці. Вядзецца падрыхтоўка да арганізацыі цэха па выробу дзіцячых цапак.

НАПЯРЭДАДНІ 15-ГОДДЗЯ ПАГРАНІЧНАЙ АХОВЫ

МАЗЫР, 11 лютага. (Кар. «Звязды»). Пагранічнікі Совецкага Палесся рыхтуюцца да 15-гадовага юбілею пагранічнай аховы. Рыхтуюцца вечары чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, на якія будуць запрошаны лепшыя людзі пагранічных калгасаў.

15 лютага/ва ўсіх пагранічных сельсоветах/ адбудуцца ўрачыстыя пленумы з удзелам байцоў Чырвонай арміі. У гэты дзень будзе арганізаваны 10-кілометравы крос па перасечанай мясцовасці, а таксама лыжны пераход.

ІМЯННЫЯ ПАСЫЛКІ СЛАЎНЫМ ПАГРАНІЧНІКАМ

ПОЛАЦК, 11 лютага. (БЕЛТА). Працоўныя Полаччыны актыўна рыхтуюцца да 15-годдзя існавання дзяржаўнай пагранічнай аховы СССР. На прадпрыемствах арганізуюцца даклады і гутаркі аб слаўных пагранічніках. На хлебазаводзе, шпалярэзным заводзе і іншых прадпрыемствах ствараюцца брыгады імя 15-годдзя пагранічнай аховы.

Рабочыя-стахановцы рыхтуюць 50 імянных пасылак пагранічнікам. Стахановцы пішуць пагранічнікам пісьмы, у якіх расказваюць аб сваёй рабоце і гатоўнасці ў любы момант разам з пагранічнікамі выступіць на абарону нашых дзяржаўных граніц.

РАЁННЫ ДОМ АБАРОНЫ

КАРМА, 11 лютага. (Кар. «Звязды»). У Карме заканчваецца будаўніцтва раённага Дома абароны. У Доме будзе некалькі габінетаў па асобных відах абарончай работы.

Газетныя радкі

СПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ ПАСТАНОЎКУ АБАРОНЧАЙ РАБОТЫ

У Гомель прыехалі рабочыя-стахановцы куйбышэўскага лесазавода № 17 «Средлес» тт. Таісаў, Васільеў і Чэрапкова. Яны прыехалі праверыць выкананне соцыялістычнага дагавору завода з дрэваапрацоўчым камбінатам імя Гікало на лепшую пастаноўку абарончай работы. («Палеская праўда»).

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ Ў КАЛГАСЕ

Электрастанцыя пушчана ў калгасе імя Дзержынскага, Падонкаўскага сельсовета (Лагойшчына). У дамах калгаснікаў загарэлася лямпка Ільіча. У бліжэйшыя дні электрычнае святло будзе праведзена ў гаспадарчыя пабудовы калгаса. («Чырвоная Лагойшчына»).



10 лютага адкрылася нарада стахановаў грамадскага харчавання. На нарадзе прысутнічалі лепшыя майстры кулінарыі. НА ЗДЫМКУ: лепшыя стахановцы, злева направа: Таралава (Віцебск), Тысікачова (Гомель), Сабалеўская (Менск). Фото А. САЛАВЕЙЧЫКА.

ТРАМВАЙ — АЎТОБУС — ТАКСІ

З кожным годам расце ўдасканалены механізаваны гарадскі транспарт і абслугоўванне ім насельніцтва. Менскі трамвай у 1931 годзе перавёз 17 млн. 620 тыс. пасажыраў, у 1932 годзе — 25 млн. 425 тыс., у 1933 годзе — 27 млн. 477 тыс., у 1934 годзе — 30 млн. 536 тыс., а ў 1935 годзе — 34 млн. 743 тыс. пасажыраў. Сярэдняя колькасць паездак на аднаго жыхара складала ў 1931 годзе 106, а ў 1935 годзе — 187. Па 8 маршрутах штодзённа перавозіцца да 95.000 чалавек. Акрамя таго аўтобусамі за 1935 год перавезена 336.627 пасажыраў. Прабег таксі за год склаў 60.485 кілометраў.

У 1934 годзе ў Менску налічваўся 41 рамізнік, у 1935 годзе — 36, а па 1936 год атрымалі рэгістрацыйныя патэнты толькі 21 рамізнік.

БУЙНЫЯ ПАКАЗАЛЬНЫЯ МАГАЗІНЫ Ў МЕНСКУ

Саюзтэкстыльшвэйгандаль Наркомунтгандля СССР адкрывае ў Менску вялікі паказальны магазін шарсцяных тканін, ільняных вырабаў, верхняга трыкатажу і галаўных убораў. Магазін будзе мець вялікае атэльле гатовага адзення. Гадавы тавараабарот намечан у суме 20 мільёнаў рублёў. Магазін адкрыецца па Совецкай вуліцы.

Вялікі магазін на Ленінскай вуліцы адкрывае Саюзгалантарэйтрыкатажгандаль. Магазін будзе гандляваць галантарэяй, трыкатажам, бялізнай і парфумерыяй. План тавараабароту вызначан у 5 мільёнаў руб. у год. Абодва магазіны будуць гандляваць выключна таварамі найвышэйшай якасці. Адкрыццё магазінаў намечана да 1 красавіка.

ЛЯКАРСТВА НА ДОМ

Па прыкладу маскоўскай цэнтральнай аптэкі менская цэнтральная аптэка арганізавала з 1 лютага дастаўку лякарства на дом. Заказы аптэка праводзіць без чаргі ў спецыяльным акенцы. Не больш, як праз гадзіну-паўтары (у залежнасці ад адлегласці), пасыльны прыносіць у спецыяльнай скрынцы лякарства на дом. Кошт дастаўкі ад 50 да 75 кап. Гр-н Ніканораў, які пражывае па Першамайскай вуліцы, заказаў лякарства ў 2 гадз. 20 мінут дня, праз 10 мінут яно было гатова, а ў 3 гадзіны яму прынеслі лякарства на кватэру. Заказ гр-на Пархоменка, які пражывае па Ленінскай вуліцы, быў выкананы праз 30 мінут.

Коратка

(Ад карэспандэнтаў «Звязды» і БЕЛТА)

* **Студыя для мастакоў-самавучак** Менска арганізавана саюзам совецкіх мастакоў БССР.
* **Гурток па вывучэнню мастацкай літаратуры** арганізаван у калгасе імя Леніна, Рымавецкага сельсовета (Вабруйшчына).
* **Ваенізаваны паход у супроцьгазах** па маршруту Гомель—Новабеліца—Гомель, прысвечаны X і XI з'ездам комсамола, праведзен у Гомелі. У паходзе прымалі ўдзел 7 тыс. чал.
* **На гастролі ў Бабруйск** прыбыў Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР.
* **З Ленінграда ў Віцебск на лыжах** прышла група работніц-стахановак ленінградскай швейнай фабрыкі імя Валадарскага. За 11 дзён яны прайшлі 642 кілометры.
* **Курсы трактарыстаў** арганізаваны пры Касцюковіцкай МТС. Каля трэцяй часткі курсантаў — дзяўчаты-калгасніцы.
* **Радыёкропкі з навушнікамі** праведзены да ложкаў хворых у гарадоцкай раённай больніцы.
* **Шоферы** Менхарчгандля тт. Попельскі, Крэйсберг і Токараў сістэматычна выконваюць план ад 240 да 250 проц. Яны эканомяць гаручае, не маюць аварый і парушэнняў правіл вулічнага руху.
* **Новы сельмаг** адкрыты ў Жодзіне, Смалявіцкага раёна.

НАША ЛЕПШАЯ ЗАБАВА ЎЗІМКУ

(ПІСЬМО ПІОНЕРАЎ І ВУЧНЯЎ)

Мы рады, што нам далі магчымасць дармова катацца на катках. Гэта наша лепшая забава ўзімку. Цяпер мы не будзем катацца на вуліцы.

Дрэнна яшчэ тое, што на катку «Дынамо» пачынаюць заліваць лёд пасля 12 гадзін дня, якраз, калі нам дазваляецца катацца. На катку сада «Профінтэрн» ужо колькі дзён не могуць ачысціць лёд ад снегу. У школах дзеці не ведаюць, што можна катацца дармова. Работнікі каткоў баяцца, каб мы не зрэзалі лёд і каб не выклікаць наплыву дзяцей, не вывешваюць аб'яў аб тым, што нам дазваляецца днём катацца.

Лаксін Ізя — 12 год, Ермоленка Вася — 11 год, Карпель Ёська — 13 год, Ліўшыц Грыша — 10 год, Бляхер Абрам — 12 год, Шестакоўскі Коля — 12 год, Красік Віця — 10 год, Юркін Юра — 8 год.

АД РЭДАКЦЫІ. «Звязда» зварачае ўвагу менскага гарана і дырэкцый каткоў «Дынамо» і «Профінтэрн» на неабходнасць неадкладнага знішчэння недахопаў, указаных у пісьме дзяцей.

ПРЭМІРАВАННЕ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ КАЛГАСА ІМЯ КОСАРЭВА

ЖЛОБІН, 11 лютага. (БЕЛТА). Фізкультурнікі калгаса імя Косарэва заваявалі адно з перадавых месц у Саюзе па разгортванню фізкультурнай работы. ВСФК СССР прэміраваў фізкультурны гурток калгаса 10.000 рублямі на пабудову калгаснага стадыёна. Лепшая фізкультурніца Марозава прэміравана імянным гадзіннікам.

КАЛГАСНІКІ—ЦЯЖКААТЛЕТЫ

У калгасе «Ленінскі шлях», Самахвалавіцкага сельсовета, Менскага раёна, арганізавалася першая ў БССР калгасная цяжкаатлетычная секцыя. У ёй займаюцца 12 калгаснікаў, з іх — 6 штангістаў, 3 барцы і 3 баксёры. Каманда калгаса будзе ўдзельнічаць ва ўсебеларускіх цяжкаатлетычных спаборніцтвах у пачатку сакавіка.

ЗДАРЭННІ

* **Пажар у гаражы.** 10 лютага ў 10 гадзін вечара пажарам быў знішчан дашчаты будынак гаража фабрыкі-кухні. У выніку пажару абгарэлі тры грузавыя аўтамашыны. Вядзецца следства.
* **Растратчык.** Намеснік дырэктара хлебааб'яднання Менгорспажыўсаюза С. А. Фірстэнберг, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, браў грошы з кас падпарадкаваных яму магазінаў, якія прысвойваў. Ён таксама пазычаў грошы ў работнікаў аб'яднання і не звяртаў іх. Такімі шляхамі ён прысвоіў 3295 рублёў, якія пракуціў і прайграў у карты. Растратчык арыштаван.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Гукавы кінатэатр „Чырвоная зорка“ — Гукавы мастацкі фільм ПАДРУГІ

Гукавы кінатэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ“ — Гукавы мастацкі фільм „Великий утешитель“

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» — Гукавы амерык. фільм ЗДРАДНІЦТВА Марвіна Блейка

Кіно «СПАРТАК» — Выдатны мастацкі фільм ПАЭТ І ЦАР

МЯНЯЮ кв. з 2-х пак. і кухні з удобст. у цэнтры 40 кв. м. на асобн. кв. з 3—4 пак. Адрас: Ленінская, 3, кв. 3. Бачыць з 6 гадз. веч.

ЗГУБЛЕНЫЯ І ЎКРАДЗЕНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ

МАЙСЕЕВІЧ І. А. — вайсковы білет; ШАБУНЯ Ф. Ф. — пашпарт; НАЗАРАВА С. Н.—профбілет; САВІНКА Т. К. — вайсковы білет; КРУК А. І.—пашпарт; ЮРАШЧЫК В. О.—профбілет; ТУРАНКОЎ А. Э. —пашпарт; КАШКАН Т. Р. — вайсковы білет; ПАЦЭВІЧ Л. І.—профбілет; ГІНЗБУРГ Т. Я. — пашпарт на дровы; КАВАЛЕЎ І. М. — пашпарт; ХАРЭЎСКАЯ А. Д. — пашпарт; ГЛАДКАЯ П. Ф. — пашпарт; ГОЛУБ Г. І. — пашпарт.

Партком і профкамісія НКУС БССР выказваюць глыбокі жаль па поваду смерці старога чэкіста члена ВКП(б) начальніка райаддзела НКУС БССР.

ЗУБАВА П. А.

і выказваюць спачуванне сям'і і родным.

Студэнты менскага дзяржаўнага будаўнічага тэхнікума групы цеплабуд № 4 выказваюць сваё спачуванне сям'і **Клебанавых** з прычыны **трагічнай смерці іх дачкі і сястры**

РАХІЛІ

ДА НАШЫХ ПАКУПНІКОЎ

У мэтах набліжэння пакупнікоў да ўдзелу ў паляпшэнні пасганоўкі работы МАГАЗІНАЎ

МЕНПРОМГАНДЛЯ,

Дырэкцыя Манканторы Белпромгандля склікае **14 лютага,** у 8 гадзін веч., у клубе „Чырвоны абутнік“ (Комунальная, 9—уваход са двара)

КАНФЕРЭНЦЫЮ ПАКУПНІКОЎ

РАЗАМ з РАБОТНІКАМІ МАГАЗІНАЎ.

На канферэнцыі будзе інфармацыя дырэктара магазіна № 10 аб тым, чым гандляваў яго магазін у 1935 г., чым будзе гандляваць у 1936 годзе і як будзе абслугоўваць пакупніка.

У час канферэнцыі **іграе аркестр музыкі.**

Пасля канферэнцыі—**мастацкая частка.**

УВАХОД ВОЛЬНЫ.

УСЕ НА КАНФЕРЭНЦЫЮ!

ДЫРЭКЦЫЯ МЕНПРОМГАНДЛЯ

АБ'ЯВА

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА ФІНАНСАВАГА АДДЗЕЛА ПА РЭГІСТРАЦЫІ ШТАТАЎ.

МЕНСКІ ГОРФІНАДДЗЕЛ

даводзіць да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў гор. Менска

парадак перарэгістрацыі штатаў,

ставак зарплаты і каштарысаў адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў.

У адпаведнасці з п. VIII пастановы СНК СССР ад 13 мая 1935 г., перарэгістрацыя праводзіцца ва ўсіх выпадках змен вышэйстаячай арганізацыяй раней устаноўленых для гэтай арганізацыі, установы і прадпрыемства штатаў, фондаў і сярэдніх ставак зарплаты служачых і каштарысаў адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў, а таксама пры зменах хоць-бы аднаго з гэтых элементаў (толькі штатаў, фондаў, сярэдняй стаўкі, або каштарысу).

Перарэгістрацыя праводзіцца не пазней 10-дзённага тэрміну з дня атрымання ўстановай, прадпрыемствам ці арганізацыяй паведамлення аб праведзеных вышэйстаячай арганізацыяй зменах.

Пры перарэгістрацыі прадстаўляецца 4 экземпляры рэгістрацыйнай карткі і па 2 экземпляры каштарысу і штатаў.

Несвоечасовая перарэгістрацыя, або ўхіленне ад перарэгістрацыі пацягне за сабой закрыццё крэдытаў па зарплаце і адміністрацыйна-кіраўнічых выдатках.

Заг. Гарфа ЗАЛЕСКІ.

Калектыў работнікаў кіраўніцтва жывёлагадоўлі Наркамзема БССР выказвае спачуванне тав. **Клебанавай Б. Б.** з прычыны пасцігшага яе гора — **трагічнай смерці яе сястры РАХІЛІ.**

Парт.-і профгрупа НКУС БССР выказваюць сваё глыбокае спачуванне супрацоўніцы НКУС **Іоніх-Раманоўскай** па поваду **смерці яе сына**

ВАЛЕНЦІНА

Да ведама арганізацый, маючых у ашчадкасе бягучыя рахункі

У сувязі з пераходам горашчадкасы на новую сістэму работы, усе бягучыя рахункі арганізацый з 11 лютага пераведзены з аддзяленняў у ашчадкасу.

З 15 лютага праводзіцца перарэгістрацыя ўсіх юрыдычных бягучых рахункаў. Для гэтага арганізацыя — уласнік рахунка—павінна прадставіць у ашчадкасу: заяву з указаннем астачы ўкладу па яго бягучым рахунку, да якога прыкласці чэкавую і разліковую кніжкі, а таксама на спецыяльных бланках у двух экземплярах узоры подпісаў распарадчыкаў крэдытаў з адбіткам пячаткі.

З 15 па 20 лютага ніякіх прыхода-расходных аперацый па бягучых рахунках арганізацый праводзіцца не будзе.

МЕНСКАЯ ГОРАШЧАДКАСА № 16.

Конкурсная камісія Менскага Горсовета

склікае

ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

камісіі па падвядзенню вынікаў конкурса па санітарнаму становішчу горада.

Пасяджэнне адбудзецца **сёння, 11 лютага** у 7 гадзін вечара, у памяшканні клуба металістаў (вул. Кірава, 12).

ПАРАДАК ДНЯ:

1) **Вынікі конкурса па санітарнаму становішчу горада** (дакл. Дзяржсанінспектара г. Менска т. **Ліўшыца** — судаклады жакцаў № 9 і 1).

Запрашаюцца грамадска-санітарныя інспектары, загадчыкі дамамі жакцаў і харчовых прадпрыемстваў, сталовых, крам, камендантыі і грамадска-санітарныя інспектары інтэрнатаў, санітарны актыў Чырвонага крыжа і медработнікі.

КОНКУРСНАЯ КАМІСІЯ.

14 ЛЮТАГА, У 6 ГАДЗІН ВЕЧАРА ў памяшканні **Беларускай акадэміі навук** (рог Ленінскай і Кірава, 29-35)

АДБУДЗЕЦЦА

АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫІ

старшым навуковым работнікам інстытута эканомікі Каплінскім І. М.

НА ТЭМУ:

„Цана ў гаспадарцы СССР і пераход да адзінай цаны“.

Афіцыяльны аппанент—в. аб. прафесара тав. **Аксельрод.**

Жадаючыя азнаёміцца з дысертацыяй могуць яе атрымаць у інстытуце эканомікі БелАН (рог Ленінскай і Кірава, 29-35).

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДА ВЕДАМА

ЎКЛАДЧЫКАЎ АШЧАДКАС ГОР. МЕНСКА.

З 19 лютага 1936 г. у Менску ўводзіцца

АДЗІНАЯ АШЧАДНАЯ КНІЖКА.

Уносячы і атрымліваючы ўклады па адзінай ашчаднай кніжцы ўкладчык будзе траціць менш часу, чым раней.

Па адзінай ашчадкніжцы ўкладчык можа ўносіць і атрымліваць свой уклад у любой ашчаднай касе горада.

Укладчык, пры жаданні можа здаць ашчадкніжку на хаванне ў адной з ашчадкас, прымацаваўшы сябе да гэтай ашчадкасы.

Кожны ўкладчык не можа мець больш адной адзінай ашчаднай кніжкі.

Усе ільготы і перавагі, якія прадастаўляюцца ўкладчыкам (тайна ўкладаў, недатыкальнасць укладаў, права завяшчальных распараджэнняў, ільготы па падатках) захоўваецца поўнасцю і пасля ўвядзення адзінай ашчаднай кніжкі.

На адзіную ашчадную кніжку можна ўнесці ўклады: дапатрабавання, тэрміновыя, або ўмоўныя.

Па ўкладах да патрабавання ўкладчык атрымлівае даход у размеры 8 проц. у год; па ўкладах тэрміновых (г. зн. на тэрмін не менш трох месяцаў) у размеры 99 проц.

Па адзінай ашчадкніжцы ўкладчык можа прадаставіць права ўносіць грошы і па даверанасці атрымліваць свой уклад любой асобе.

Ашчадкніжкі 2 ўзору абменьваюцца на адзіную ашчадную кніжку ў любой ашчаднай касе, прычым запаўненне (адзінай) ашчадкніжкі ў гарадской ашчадкасе праводзіцца ў прысутнасці ўкладчыка, а ў аддзяленнях — на наступны дзень.

Тэрміны пераводу ашчадкас горада на новую сістэму работы наступныя:

Гарадская ашчадкаса — 19 лютага г. г.
Першае і трэцяе аддзяленні 2 сакавіка.
Усе астатнія ашчадкасы — 7 сакавіка.
Напярэдадні дня пераходу — ашчадкасы будуць закрыты.

Тэрмін абмену не абмежаваны. Таму спецыяльна з'яўляцца ў ашчадкасу для абмену ашчадкніжкі не трэба. Ашчадкніжку можна абмяняць пры чарговым наведванні ашчадкасы для ўзносу, або атрымання ўкладу.

Адзіную ашчадкніжку трэба хаваць беражна. Пры згубе яе неабходна неадкладна паведаміць аб гэтым любой ашчадкасе горада. Дублікат згубленай адзінай ашчадкніжкі выдаецца праз 15 дзён, за выдачу дубліката ўкладчык плаціць 1 рубель.

Пры атрыманні адзінай ашчадкніжкі ўкладчык абавязкова павінен прад'явіць свой пашпарт для праверкі ўзору яго подпісу ў ашчаднай кніжцы.

МЕНГОРАШЧАДКАСА № 16.

ПАСТАНОВА № 4

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА ад 10 лютага 1936 г.

АБ ПРАВЯДЗЕННІ ПЕРАПІСУ ПРАМЫСЛОВАСЦІ СОЦСЕКТАРУ г. МЕНСКА ПА СТАНОВІШЧУ НА 1 СТУДЗЕНЯ 1936 Г.

На падставе пастановы СНК СССР ад 11 студзеня 1934 г. за № 62 і пастановы СНК БССР ад 26 студзеня 1936 г. за № 52, Менскі гарадскі совет **пастанаўляе:**

1. Даручыць інспектуры Наргасуліку правесці перапіс усёй прамысловасці соцсектара г. Менска па становішчу на 1 студзеня 1936 г. па агрплану і праграме ЦУНХУ Дзяржплана.

2. Перапісу падлягаюць усе прадпрыемствы дзяржаўных, кааперацыйных і грамадскіх арганізацый горада, адпавядаючыя прызнакам, указаным у пастанове ЦУНХУ Дзяржплана СССР ад 17 снежня 1935 г. за № 1005.

3. Абавязаць усе дзяржаўныя, кааперацыйныя і грамадскія арганізацыі горада, маючыя ў сваім падпарадкаванні прамысловыя прадпрыемствы, да 14 лютага г. г. з'явіцца ў інспектуру Наргасуліку на інструктаж і за атрыманнем фармуляраў па перапісу.

4. Фармуляры перапісу павінны быць запоўнены і зданы ў інспектуру Наргасуліку (Горсовет, пакой № 52) не пазней 20 лютага 1936 г.

5. За ўхіленне ад перапісу, або за парушэнне тэрмінаў перапісу, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў, указаных у пункце 4, падлягаюць адміністрацыйнай адказнасці — штрафу да 100 руб.

6. Даручыць інспектуры Наргасуліку прыцягваць да крымінальнай адказнасці кіраўнікоў прадпрыемстваў, прадставіўшых у бланках перапісу неправільныя весткі.

Старшыня Менгорсовета Е. ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менгорсовета І. КАЗЛОЎСКІ.

Уп. Галоўлітбела № К—28 Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Тыраж 104.025